Пролетарыі усіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 105 (4010)
СУБОТА, 18 КРАСАВІКА 1931 г.
Цана нумару 5 коп.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА

ПАСТАНОВА БЮРО ЦК КП(б)Б

ад 16 красавіка 1931 г.

аб выкліках раённых работнікаў у Менск цэнтральнымі ўстановамі

ЗАБАРАНІЦЬ УСІМ ЦЭНТРАЛЬНЫМ УСТАНОВАМ НА ЧАС ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ ДА 15-ГА МАЯ ВЫКЛІК РАЁННЫХ РАБОТНІКАЎ У МЕНСК ПА РОЗНЫХ СПРАВАХ.

СЕНЬНЯ АДКРЫВАЮЦЦА КУРСЫ РЭДАКТАРОЎ ШМАТТЫРАЖ

СЕНЬНЯ ПАЧЫНАЮЦЬ РАБОТУ УСЕБЕЛАРУСКІЯ КУРСЫ РЭДАКТАРОЎ НОВАСТВАРАЕМЫХ ШКЛОГРАФІЧНЫХ ШМАТТЫРАЖНЫХ КАЛГАСНЫХ І ФАБРЫЧНА-ЗАВОДСКІХ ГАЗЭТ.

КУРСЫ АРГАНІЗАВАНЫ КУЛЬТПРОПАМ ЦК КП(б)Б І РАЗЬЛІЧАНЫ НА 100 ЧАЛ.

ЗГОДНА ПАСТАНОВЫ САКРАТАРЫЯТУ ЦК КП(б)Б ПРЫ УСІХ БУЙНЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАХ, КАЛГАСАХ, САЎГАСАХ І МТС САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ ПАВІННЫ БЫЦЬ СТВОРАНЫ ШМАТТЫРАЖНЫЯ ДРУКАВАНЫЯ АЛЬБО ШКЛОГРАФІЧНЫЯ ГАЗЭТЫ.

РЭДАКЦЫЯ «ЗЬВЯЗДЫ» ШЛЕ ГАРАЧАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ НОВАМУ АТРАДУ БАЛЬШАВІЦКАГА ДРУКУ—УДЗЕЛЬНІКАМ УСЕБЕЛАРУСКІХ КУРСАЎ РЭДАКТАРОЎ ШМАТТЫРАЖАК.

17 ДЗЕНЬ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ПРАВЕРКІ

АПОШНІЯ ЧАТЫРЫ ДНІ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ПРАВЕРКІ

ператворым у штурм прарываў у падрыхтоўцы да сяўбы

Арганізацыя магутнага нарастаньня калгаснай хвалі, поўнае выкананьне плянаў кантрактацыі, забесьпячэньне калгасаў насеньнем і цягавай сілай, пераход на зьдзельшчыну ацэненую ў працаднёх, ліквідацыя абязьлічкі, забесьпячэньне выкананьня пасеўнага пляну аднаасобным сэктарам—вось асноўныя баявыя задачы, якія павінны быць абавязкова ажыцьцёўлены да канца генэральнай праверкі

Рапарт раёнаў партыі аб завяршэньні падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай вясны зьявіцца найлепшым адказам на паход імпэрыялістаў супроць савецкай пяцігодкі, на імкненьні кулакоў і апартуністаў сарваць разгорнутае сацыялістычнае наступленьне

Менск, 18 красавіка

Позьняе наступленьне вясны затрымлівае разгортваньне палявых работ. Тэрміны сяўбы скарачаюцца. У сувязі з гэтым самая сяўба будзе праходзіць больш напружанымі тэмпамі, чым летась. Гэта ставіць перад намі задачу спаткаць вясну сапраўды на ўсеўзброенні, падкаванымі на ўсе 100%. Патрэбна яшчэ больш арганізаваная, яшчэ больш напружаная падрыхтоўка.

Аднак, весткі з месц гавораць, што адозва ЦК УсеКП(б) ад 5 красавіка і пастанова красавіцкага аб'еднага пленума ЦК і ЦКК КП(б)Б аб фарсаваным завяршэньні падрыхтоўкі да вясны выконваецца дрэнна. Мінулыя 16 дзён генэральнай праверкі яшчэ не забясьпечылі ўмову, неабходных для ўдарнага правядзеньня другой бальшавіцкай сяўбы.

З недапушчальным адставаньнем у мабілізацыі насеньня не пакончана. Калгасы сеялі насенных фондаў усяго прыблізна на 60 проц. Да гэтага часу яшчэ далёка ня ўсюды насеньне прасунута з раённых складаў у калгасы і вёскі. Яркай ілюстрацыяй зьяўляецца становішча ў Вульскім раёне, дзе 368 тон розмаіта насеньня марынуецца на складзе райкалгасаюзу.

Яшчэ горш з падрыхтоўкай каня. Кармавыя фонды створаны ня больш чым у 30 проц. калгасаў. У гэтай галіне праяўляецца злачынна мала ініцыятывы і распарадчасьці з боку раённых земельна-калгасных арганізацый. Даволі прывесьці факты з Дрысьенскага раёну, дзе ў адных калгасах ёсьць лішкі кармоў, а ў другіх няма нічога. Гэты раён не арганізаваў перакідкі фуражу з адных калгасаў у другія. У сьвятле гэтага заслугоўвае быць аднаважная практыка Гарадоцкага раёну, дзе новыя калгасы самі аказелі дапамогу фуражом калектывам, якія фуражу ня маюць. Раённыя земельна-калгасныя арганізацыі павінны неадкладна ўзяцца за перакідку кармоў з аднаго калгасу ў другі. Гэта ў значнай ступені палепшыць становішча з кормамі. Са злачынкай павольнасьцю ў ажыцьцёўленьні гэтых мерапрыемстваў патрэбна быць паведзена рашучая барацьба, як з апартуністычнай бязьдзейнасьцю, якая на руку кулаку.

15 красавіка мінуў тэрмін скончаньня кантрактацыі збожжавых культур. Паводле даных з месц, гэтае важнейшае палітыка-гаспадарчае мерапрыемства да сёньня яшчэ ня ўсюды ажыцьцёўлена. Работа на правядзеньні кантрактацыі ў аднаасобным сэктары, а таксама ў калгасах у значнай частцы раёнаў ні ў якім разе ня можа быць прызнана здавальняючай. Прыкладам можа служыць гэта-б Халопеніцкі раён, які выканаў толькі 16,4 проц. заданьня на збожжавых і карміавых культурах.

Прычынай адставаньня ў галіне кантрактацыі зьяўляецца праваапартуністычная стаўка на самацёк, адміністраваньне «левакоў», непыстарчальны адпор кулаку і слабасьць масавай работы ў радзе раёнаў.

Мы яшчэ не дабіліся рашучага зрыву і ў справе ажыцьцяўленьня дырэктывы аб перавозе калгасаў і саўгасаў на зьдзельшчыну. Саўгасы, якія абавязаны былі ісьці наперадзе, плятуцца ў хвасьце. Саўгасныя трасты і Трактарацэнтр недапушчальна тупа паварачваюць ца ў бок гаспадарчага разьліку і перавозку сваіх прадпрыемстваў на зьдзельшчыну. Практычнага ў гэтай галіне саўгасы, мякка кажучы, зрабілі вельмі мала. Не дасягнут зрух і ў перавозе на зьдзельшчыну калгасаў. Усяго толькі 700 калгасаў з больш, чым 6 тыс. лічацца пераведзенымі на зьдзельшчыну, ацэненую ў працаднёх. Як ажыцьцяўляецца зьдзельшчына,—зямельныя органы ня ведаюць. Адрыўчаныя-ж весткі гавораць, што ў радзе месц дапушчаны грубейшыя скажэньні: пераходзяць на зьдзельшчыну, а норм не ўстанаўліваюць; над выгадамі зьдзельшчыны ўводзіцца фактычна падзёнічына і г. д. Арганізацыя працы на прынцыпах зьдзельшчыны ня ўсюды ўрэгулявана з разгортваньнем сацспаборніцтва і ўдарніцтва. У большасьці раёнаў праўлёнцы яўная недаацэнка таго, што зьдзельшчына, ацэненая у працаднёх, дае самыя шырокія магчымасьці для разьвіцьця масавага спаборніцтва і ўдарніцтва, што без правільнай арганізацыі працы на прынцыпах зьдзельшчыны немагчыма ў тэрмін скончыць сяўбу ў спецыфічных кліматычных умовах гэтага году.

Яшчэ менш зроблена ў галіне ліквідацыі «абязьлічкі». Нават МТС яшчэ не прапрацавалі гэтага пытаньня. У калгасах-на дырэктыва аб ліквідацыі «абязьлічкі» не прапрацавана, за выключэньнем паасобных выпадкаў.

Прымаючы пад увагу наблізьненьне вясны, нельга прыняць здавальняючым варастаньне калгаснага прыпляву у значнай частцы раёнаў. Рад раёнаў усё яшчэ недапушчальна адстае, яўна зрываючы плян калектызацыі. Так, на 10 красавіка Городоцкі раён быў калектызаваны усяго на 11,4 проц., Рэчыцкі—на 11,7 проц., Менжэскі—на 12,3 проц., Сьмілавіцкі—па 15,6 і г. д. Падаўшы факты гадорань аб тым, што ў адстаючых раёнах не ліквідавана праваапартуністычная стаўка на самацёк, што шкоднічаюць дзейнасьць кулацкая ня сустракае належнага адпору. Такое становішча пагражае ажыцьцяўленьню плану разьвіцьця тэхнічных культур і жывёлагадоўлі, г. зн.—асноўных галін сельскай гаспадаркі БССР.

Апошнія 4 дні генэральнай праверкі павінны стаць днімі бальшавіцкага штурму прарываў у падрыхтоўцы да сяўбы. Арганізацыя магутнай хвалі калгаснага прыпляву, поўнае выкананьне пляну кантрактацыі, забесьпячэньне калгасаў насеньнем і цягавай сілай, пераход на зьдзельшчыну, ацэненую ў працаднёх. Як ажыцьцяўляецца зьдзельшчына,—зямельныя органы ня ведаюць. Адрыўчаныя-ж весткі гавораць, што ў радзе месц дапушчаны грубейшыя скажэньні: пераходзяць на зьдзельшчыну, а норм не ўстанаўліваюць; над выгадамі зьдзельшчыны ўводзіцца фактычна падзёнічына і г. д. Арганізацыя працы на прынцыпах зьдзельшчыны ня ўсюды ўрэгулявана з разгортваньнем сацспаборніцтва і ўдарніцтва. У большасьці раёнаў праўлёнцы яўная недаацэнка таго, што зьдзельшчына, ацэненая у працаднёх, дае самыя шырокія магчымасьці для разьвіцьця масавага спаборніцтва і ўдарніцтва, што без правільнай арганізацыі працы на прынцыпах зьдзельшчыны немагчыма ў тэрмін скончыць сяўбу ў спецыфічных кліматычных умовах гэтага году.

Яшчэ менш зроблена ў галіне ліквідацыі «абязьлічкі». Нават МТС яшчэ не прапрацавалі гэтага пытаньня. У калгасах-на дырэктыва аб ліквідацыі «абязьлічкі» не прапрацавана, за выключэньнем паасобных выпадкаў.

Прымаючы пад увагу наблізьненьне вясны, нельга прыняць здавальняючым варастаньне калгаснага прыпляву у значнай частцы раёнаў. Рад раёнаў усё яшчэ недапушчальна адстае, яўна зрываючы плян калектызацыі. Так, на 10 красавіка Городоцкі раён быў калектызаваны усяго на 11,4 проц., Рэчыцкі—на 11,7 проц., Менжэскі—на 12,3 проц., Сьмілавіцкі—па 15,6 і г. д. Падаўшы факты гадорань аб тым, што ў адстаючых раёнах не ліквідавана праваапартуністычная стаўка на самацёк, што шкоднічаюць дзейнасьць кулацкая ня сустракае належнага адпору. Такое становішча пагражае ажыцьцяўленьню плану разьвіцьця тэхнічных культур і жывёлагадоўлі, г. зн.—асноўных галін сельскай гаспадаркі БССР.

Бюлетэнь № 16

Арганізацыя сьвінагадоўчых фэрмаў праходзіць яўна нездавальняюча. На 15 красавіка арганізаваны ўсяго 64 фэрмы замест вызначаных плянам 1.300. Весткі аб ходзе арганізацыі сьвінагадоўчых фэрмаў даны толькі 17 раёнамі.

У Смалявіцкім, Койданаўскім і Заспаўскім раёнах замест таго, каб прыступіць да арганізацыі сьвінагадоўчых фэрмаў, займаюцца разважаньнямі аб іх мэтазгоднасьці. Старшыня Смалявіцкага райвыканкому на запытаньне, чаму нічога ня робіцца ў справе арганізацыі фэрмаў, адказаў: «Было-б сала і мяса, а фэрмы заўсёды насьпеем арганізаваць».

Райкалгасаюз і райвыканком Бярэзінскага раёну лічаць, што цытаньне арганізацыі сьвінагадоўчых фэрмаў зьлучэнцца справай ня сьпешнай.

Без асабістага подпісу старшыні Сьвінаводцэнтру Жытковіцкі райвыканком ня хоча заключаць дагавароў. У выніку — цягаціна.

Треба адзначыць, што раённыя арганізацыі, ня гледзячы на адныя дырэктывы ЦК і СНК, да гэтага часу пытаньнем арганізацыі сьвінагадоўчых фэрмаў не аддаюць належнай увагі.

Дрэнна таксама ўсё яшчэ стаіць пытаньне з забесьпячэньнем сьвінагадоўчых фэрмаў адпаведнымі спэцыялістамі. Сыстэме Сьвінаводцэнтру перадана 37 ветдактароў і 117 ветфэльчароў. Зная на горш з забесьпячэньнем ніводнай патрэбнымі зоатэхнікамі.

Пастановай калегіі Наркамзему даручана ўсім сыстэмам перадаць сьвінагадоўчым фэрмам сваіх зоатэхнікаў, але гэта пастанова ў жыцьцё не праводзіцца.

Блытаніна з плянамі зрывае пасеў тэхкультур

ВЕТРЫНА. Кантрактацыя ільну ў калгасах, якія абслугоўваюцца Ветрынскай МТС, праходзіць марудна. 16 проц. плошчы яравога клёну ў гэтых калгасах павінна быць занята ільном. У адпаведнасьці з гэтым калгасы «Аўгадор» і «КІМ» прынялі плян пасеву ільну з перавышэньнем, першы — на 3 проц. і другі — на 1,2 проц. Аднак, ёсьць калгасы, якія ганебна адстаюць. Яны спасылаюцца на недахват рабочай сілы і зьмяншаюць плошчу пасеву пад ільном. Калгас «Новы шлях» зьменшыў плян на 12 проц., «Ідэал» — на 10 проц. і г. д.

Вінаваты і райза, які даў калгасам зьмененыя планы, не ўгаварыўшы іх з МТС. Трактарацэнтр таксама спазьніўся з дачай плянаў МТС па насеве ільну. Такім чынам атрымалася, што частка калгасаў прынята пляны, вызначаючыя МТС, а частка вызначаныя райза. Гэта блытаніна выклікае неабходнасьць зьмены плянаў у некаторых калгасах. Пакуль-жа гэтыя паправкі яшчэ ня зроблены.

Треба памятаць, што ў гэтым годзе будзе пабудован ільназавод і, каб нарузіць яго, пляны ільну павінны быць выкананы. МТС зараз-жа павінны дабіцца таго, каб 16 проц. яравога клёну ў калгасах былі заняты ільном.

Апартуністычная ўстаноўка т. Шавеля

ХАЛОПЕНІЧЫ. Халопеніцкі раён мае ільнаводна-жывёлагадоўчы напрамак. У калгасах павінна быць закантрактавана, апрача ільну, вікі — 65 га, сераДзелі — 10 га, лубіну — 65 га, канюшыны — 24 га, бульбы — 238 га, гароху — 113 га і канапель — 57 га. Кантрактацыя гэтых культур зьяўляецца непасрэднай задачай раёну, які мае ільнаводна-жывёлагадоўчы напрамак.

На сёньнешні дзень паказаных культур закантрактавана толькі 16,4 проц. Адной з прычын такіх марудных тэмпаў кантрактацыі зьяўляецца няправільная ўстаноўка старшыні райкалгасаюзу т. Шавеля. Тав. Шавель лічыць, што апрача ільну калгасы нічога не павінны кантрактаваць. Гэта думка значна пашырылася і сярод калгасаў. Вынікам гэтага мы маем мізэрны процант выкананьня на такіх важных культурах, як кармовыя травы.

Райком партыі і РВК павінны зрабіць належныя вывады. Апартуністычная ўстаноўка Шавеля фактычна вядзе да падрыву пасеўнаводчай базы. Шавелю трэба растлумачыць, што без насеньня кармовых траў нельга праводзіць спэцыялізацыю раёну з ільнаводча-жывёлагадоўчым напрамкам.

Неабходна правесьці растлумачальную работу сярод калгасьнікаў і дабіцца поўнага выкананьня пляну кантрактацыі.

Прыежджы.

На зьдельшчыну пераводзяцца па-габінэтнаму

ЖЛОБІН. (Наш кар.).

У справе выкананьня дырэктывы аб пераводзе калгасаў на зьдельшчыну, ацэненую ў працаднёх, яруху ўсё яшчэ не дасягнута. На зьдельшчыну пераведзена толькі 16 калгасаў з 51-го. Паасобныя калгасы пераведзены па зьдельшчыну па-габінэтнаму. Гэта пытаньне не абмяркоўвалася нават на апошнім сходзе калгасьнікаў (напрыклад, у калгасах Мормальскага сельсавету).

Некаторыя аграномы, якія накіраваны ў калгасы, пры пераводзе на зьдельшчыну не арганізуюць выпрацоўкі нормы, гаворачы: «Гэтай справай яшчэ рана займацца». Агроном Линевіч за ўвесь час прабываньня на вёсцы не перавёў ні аднаго калгасу на зьдельшчыну. Раённыя земельна-калгасныя арганізацыі не рэагуюць на бязьдзейнасьць агранэрсаналу.

Пляны пахавалі у кішэнях

ВУШАЧЫ. Прэзыдыум Гарадзецкага сельсавету, атрымаўшы плянавае заданьне па кантрактацыі яравых, яшчэ ў сакавіку даручыў членам сельсавету правесьці абгаварэньне і прынятае плянаў кантрактацыі па сваіх вучастках. Члены сельсавету, атрымаўшы пляны, палажылі іх у кішэні. Сходы кантрактантаў ня былі праведзены і пляны засталіся незавезенымі да дваро.

Два тыдні сельсаветчыкі спакойна сядзелі ў габінэце і такалі: «Вось члены хутка прыйдуць пратаколы аб тым, што кантрактацыя прынята».

Але ня так бывае, як думаюць галаваногія.

Камсамольская і прафсаюзная брыгады, якія прыехалі ў сельсавет, выявілі, што па сельсавеце ні адзін га яравых не закантрактован. Пляны кантрактацыі засталіся ляжаць у кішэнях членаў сельсавету. Ніякіх сходаў і гутарак аб кантрактацыі ў сельсавеце не праводзілася.

Апартуністычная бязьдзейнасьць Гарадзецкага сельсавету — асноўная прычына зрыву кантрактацыі. На такіх работнікаў трэба ўдарыць, як на агентах клясавага ворага.

Г. Я.

Правая рука ня ведае, што робіць левая

У «Зьвязьдзе» пісалася аб несвачасовым завозе фуражу для Гомельскага ЦРК з прычыны бюракратызму на ст. Ельск. І толькі пасьля сыгналу «Зьвязды» корм быў адгружан з Ельску для Гомельскага ЦРК у колькасьці 4 вагонаў. Але на ст. Калінкавічы сена дагнала сьмешная наперка Беларускай канторы Саюзхлеба наступнага зьместу:

«Мазырскаму пункту.

Адгрузка сена-саломы ў Гомель для ЦРК у колькасьці тысячы тон па нашым нарадзе № 47299 анулюецца. Загадчык фуражнага аддзелу Наумоўскі».

Сена, прызначанае Гомельскаму ЦРК, было тут-жа перадана другой арганізацыі. Вельмі цікава, чым выклікана распарадзьненьне аб скасаваньні нараду? Ці можа тав. Наумоўскі думае, што Гомельскаму ЦРК патрэбна разьбіраць жалезныя страхі і карміць кароў.

Пасьля трывожных сыгналаў Гомеля, той-жа Наумоўскі аддае сурэвы загад таму-ж Мазырскаму пункту наступнага зьместу:

«Па паведамленьні прадстаўніка Гомельскага ЦРК тав. Рохліна, што адгружанае вамі ў лік нараду № 47299, дакладна вам на 840 тон сена і саломы, было затрымана ў дарозе на ст. Калінкавічы, і далейшая адгрузка спынена. Просім тэрмінова даць тлумачэньне, чым выклікана з вашага боку такое распарадзьненьне. Загадчык фуражным кіраўніцтвам Наумоўскі».

Мы ў сваю чаргу патрабуем ад вас, тав. Наумоўскі, тлумачэньня аб тым, чым выклікана такая дзітаніна, якая каштуе жыцьця жывёле і сродкаў дзяржаве. Вы адной рукой будуеце, а другой разбураеце.

Такое становішча прымушае біць трывогу, што ў Беларускай канторы Саюзхлеба бюракратызм і галаваногства вынялі сабе гняздо і сталі ўлоперак дарогі, каб ня пусьціць фуражу ў саўгасы і калгасы.

Ч.

НЕАДКЛАДНА СКОНЧЫЦЬ КАНТРАКТАЦЫЮ ЗБОЖЖАВЫХ

5 МАЯ — АПОШНІ ТЭРМІН ДЛЯ СКАНЧЭНЬНЯ КАНТРАКТАЦЫІ ТЭХКУЛЬТУР

Пастанова калегіі НК РСІ БССР ад 15-IV-1931 г.

1. Адзначыць, што пастанова СНК аб сканчэньні работы па кантрактацыі да 15 красавіка ня выканана. Цэнтральныя калгасна-каапэрацыйныя ўстановы (Малжыгасаюз, Ільнасаюз, Садгародсаюз і Насенаводсаюз) апартуністычна адносіліся да правядзеньня работы па кантрактацыі, у выніку чаго забесьпячэньня раёнаў дагаварамі затрымалася да канца сакавіка месяца.

2. Адсутнасьць дагаворанасьці паміж сыстэмамі с.-г. каапэрацыі, у выніку чаго выяжджаючыя работнікі паасобных сыстэм праводзяць работу па кантрактацыі тых культур, якія ўскладзены на ланую сыстэму, а іншымі культурамі ня цікавяцца.

3. Адсутнасьць разгортваньня масавай работы на заключэньні дагавароў як у калгасах, таксама і сярод аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Заключэньне дагавароў у калгасах праходзіць пры ўдзеле аднаго старшыні калгасу (Талачынскі раён). Кантрольныя лічбы па кантрактацыі на агульных бядняцка-серадняцкіх сходах абгаварваюцца бяз усякай падрыхтоўкі, галасаваньне аб прыняцьці кантрольных лічбаў праходзіць насьпіна, пры галасаваньні не галасуюць ні за, ні супроць і кантрактацыя лічыцца прынятай (Глускі раён), што треба разглядаць, як скрыўленьне лініі партыі.

4. Адозва ЦК УсеКП(б) і СНК СССР, ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб кантрактацыі не растлумачана, РВК і райкаапсаюзы не зьвярнулі належнай увагі на прапрацоўку гэтай вапшчнай дырэктывы (Заслаўскі, Жураўскі, Любоўскі і Сьмілавіцкі раёны). Некаторыя раёны бязьдзейнічаюць і да гэтага часу не прыступілі да правядзеньня кантрактацыі (Жлобінскі, Чэчэрскі раёны).

5. Наркамзем і Наркамгандаль засталіся ў баку ад кіраўніцтва і сваячасовага правядзеньня.

6. Кантрактацыя насеньня гатункова-га аўса, кораньплодаў, насеньня траў і асабліва кантрактацыя сена—стаіць пад пагрозай зрыву. Па сыстэме насенаводсаюзу з 32-х раёнаў—14 раёнаў да гэтага часу не разьмясьцілі кантрольных лічбаў (Хойніцкі, Мазырскі, Капаткевіцкі, Юраўцкі і інш. раёны). Ёсьць моманты скарыстываньня высакаякаснага кораня плоду для жывёлы (Талачынскі раён).

7. Назначыць усіх гэтых апартуністычных адносін да працы на правядзеньні кантрактацыі мае сваім вынікам ганебныя лічбы выкананьня пляну. На 1-IV закантрактавана на збожжавых культурах 18,3 проц., па ільнезалажнае—28,2 проц., па пяньцы—27,1 проц., па бульбе—12,8% і па сене—3,0 проц.

Выходзячы з гэтага, Калегія НК РСІ пастанаўляе:

а) Катэгарычна прапанаваць сыстэмам сельска-гаспадарчай каапэрацыі (Малжыгасаюзу, Насенаводсаюзу, Садгародсаюзу і Ільнасаюзу) пад адказнасьць загаўчыкаў устаноў скончыць працу па правядзеньні кантрактацыі ў кантрактова вызначаны тэрмін ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б.

б) Прапанаваць РВК і райкаапсаюзам выправіць наяўныя памылкі ў заключэньні дагавароў у калгасах бяз узьведу калгасьнікаў, а таксама сярод аднаасобных бядняцка-сераднянцкіх гаспадарак, дзе пытаньне кантрактацыі ня было ў належным парадку выпрацавана і дзе адозва ЦК УсеКП(б) і СНК СССР, ЦК КП(б)Б і СНК БССР—не прапрацавана. Правядзеньне кантрактацыі павінна працягвацца пры абавязковым абгаварэньні адозвы.

в) Указаць Наркамзему і Наркамгандалю на невыстарчальнасьць кіраўніцтва работай па правядзеньні кантрактацыі і на марудносьць рэагаваньня на спартуністычныя адносіны паасобных сыстэм сельска-гаспадарчай каапэрацыі, а таксама тых РВК і райкаапсаюзаў, якія бязьдзейнічалі ў разгортваньні працы па кантрактацыі.

г) Прапанаваць (Наркамгандалю, Малжыгасаюзу, Садгародсаюзу, Ільнасаюзу і Насенаводсаюзу) скарыстаць прадпрыемкоў апарату для пасылкі ў раёны для ўзмацненьня працы па кантрактацыі і правяркі якасьці заключаных дагавароў.

д) За бязьдзейнасьць і адсутнасьць усякай работы па правядзеньні кантрактацыі Жлобінскаму і Чэчэрскаму старшыням райкаапсаюзаў—абвясьціць вымову.

е) Катэгарычна прапанаваць Белыніскаму пад адказнасьць тав. Ліліса, не пазьней 3-хдзённага тэрміну—даць указаньне раёнам аб кантрактацыі ільну на трасту.

ж) Прапанаваць Наркамзему і Наркамгандалю выявіць тыя раёны, якія не разьмяркавалі кантрольных лічб па кантрактацыі і прыняцьцю да адказнасьці.

з) Указаць Талачынскаму РВК і райкаапсаюзу на недапушчальныя зьявішчы скарэньня калгасамі высакаякаснага кораньплоду для жывёлы.

і) Прапанаваць РКК-РСІ ўстанавіць систематычны кантроль аб ходзе кантрактацыі і сваячасова рэагаваць на марудны ход заключэньня дагавароў.

к) У канцы красавіка заслухаць на калегіі НК РСІ аб выкананьні гэтай пастановы.

Нарком РСІ Беларусі КАЛНІН.

Плян кантрактацыі павінен быць выканан

10 сельсаветаў не закантрактавалі ніводнага гэкт.

ПУХАВІЧЫ. На 10-е красавіка Пухавіцкі раён выканаў плян кантрактацыі ўсіх відаў па індывідуальным сэктары на 23 проц., а па сене — 4 проц. Асноўная прычына адставаньня раёну заключаецца ў тым, што райком, РВК, райза і райсэкадзэл недаацэньваюць значэньня кантрактацыі і глыбокадумна разважаюць, што гэта справа толькі райкаапсаюзу. Адказныя работнікі, якія выяжджаюць у сельсаветы, маюць тэмія-ж настрої і займаюцца ўсімі пытаньнямі, але толькі не кантрактацыяй. Вынікам гэтага на 10-га красавіка ў 19 сельсаветаў 10 сельсаветаў — Новасёлкаўскі, Сяргееўскі, Цыранскі, Сычанскі, Пухавіцкі, Дрычынскі, Кнорынскі, Горацкі, Узьлянскі і Дудзінскі — да гэтага часу не закантрактавалі ніводнага гэктара.

Пасланы тав. Бандаляраў у Кнорынскі сельсавет заявіў, што кампанію па кантрактацыі можна адкласьць да першага красавіка з прычыны загружанасьці сельсавету насеўнай кампаніяй. Тав. Кудзін, атрымаўшы матар'ял ад райвыканкому, па прыезьдзе ў Новасельскі сельсавет аддаў матар'ял, дадаючы пры гэтым, што гэтай справай будзе займацца райкаапсаюз. Блюйскаму сельсавету райкомам вылучана некалькі таварышоў на правядзеньне кампаніі, але райком забыўся прасачыць за выкананьнем сваёй пастановы, а вылучаныя таварышы забыліся выехаць з раёну ў сельсаветы і ў выніку ў старшыні сельсавету застаўся толькі адзін сьпіс дый сам сельсавет не клапоціцца аб кантрактацыі, — ноў, гэта справа каапэрацыі. Поўная бязьдзейнасьць сельсавету.

Некаторыя прабуюць ацэньваць кантрактацыю па той прычыне, што аднаасобнікі ідуць у калгасы, прыдзецца пераакантраціць дагавары, а таму перш за ўсё, калектывізуем, а пасьля закантрактуем. Камсамол работы вакол кантрактацыі не разгарнуў. Масавая работа з беднатой адсутнічае. Адозва СНК і ЦК аб кантрактацыі ва многіх сельсаветах не прапрацоўвалася. У Батарскім сельсавеце кулакі і падкулачнікі тройці раз сарвалі сход аднаасобнікаў, дзе абмяркоўвалося пытаньне аб кантрактацыі. Парт'ячэйка і сельсавет не далі адпору кулаку. Адозва СНК і ЦК не прапрацоўвалася ня толькі з бядняцкім, але нават і з калгаснымі.

Напрыклад, камуна «Зара» і калгас «Авангард». Дагавары на кантрактацыі на агульным сходзе калгасьнікаў не прапрацоўваюцца, заключаюцца габінэтным парадкам. Сацспаборніцтва памёж калгаснымі і сельсаветамі за лепшае выкананьне пляну кантрактацыі ня ўжываецца.

Першая дэкада красавіка дала нізкае павышэньне процанту выкананьня пляну кантрактацыі. Пры такой апартуністычнай хутчасьці патрэбны яшчэ 2 месяцы, каб скончыць кантрактацыю яравых пасеваў сена і насенных траў, тым больш для спаж. каапэрацыі, якая да кантрактацыі бульбы яшчэ не прыступала. Такія бядбайныя і злачынныя адносіны да кантрактацыі не павінны застацца не пакаранымі. Патрэбен бязадкладны пералом, рашучая барацьба з кулаком, падкулачнікам і апартуністычнай практыкай.

Раённыя арганізацыі павінны бязадкладна мабілізаваць усе лепшыя сілы, прымацоўваючы іх да сельсаветаў і вёсак з персанальнай адказнасьцю за правядзеньне і ліквідацыю прарыву ў кантрактацыі. Арганізаваць масавую работу, сярод бядняцка-сераднянцкіх гаспадарак пакол кантрактацыі, пішым абмеркаваньнем прычынам для апрацоўкі ганебнага ходу кантрактацыі не павінна мець месца. Плян кантрактацыі па ўсіх відах павінен быць выканан ва ўстаноўлены ўрадам тэрмін.

ІВАНОЎ.

Гарадок яшчэ не дабіўся

рашучага пералому

Тэмпы калектывізацыі нездавальняючыя.—Індывідуальны сэктар—самы адстаючы вучастак

ГАРАДОК. (Брыгада «Зьвязды»).

Першыя дванаццаць дзён генэральнай праверкі яшчэ не далі рашучага пералому ў падрыхтоўцы да другой бальшавіцкай сяўбы на Гарадоцкім раёне. **Становішча па калгасах і асабліва па індывідуальным сэктары ўсё яшчэ зусім незадавальняючае.**

Некаторы зрух дасягнут калгасамі толькі па лініі ссыпкі насеньня. Насенныя фонды па сацыялістычным сэктары ўжо створаны поўнасьцю. Страхавыя-ж—толькі на 70 проц. Вельмі дрэнна са стварэньнем браніваных кармовых фондаў, якія ёсьць толькі ў 17-ці калгасах. Ня гледзячы на пагражаючае становішча з кормамі, райкалгасаюз не арганізаваў перакідку фуражу з аднаго калгасу ў другі. У сьвятле гэтага цікава адзначыць, што некаторыя падаўна арганізаваныя калектывы на сваёй ініцыятыве забясьпечваюць старыя калгасы фуражом. Райкалгасаюз практычна нічога таксама не зрабіў, каб арганізаваць збор і ўжываньне сурагатаў кармоў (сечку, корм з гальля).

План рамонту інвэнтару калгасамі выкананы на 85 проц. У якім становішчы калгасны транспарт—райкалгасаюзу невядома.

Усё яшчэ ніякіх мер раённымі арганізацыямі ня ўжываецца, каб ліквідаваць затаваранасьць машын і інвэнтару на раённым складзе.

Разьмеркаваньне ўраджаю і прыбытку ўжо праведзена па ўсіх калгасах, але яўна няправільна. Катэгарычнай дырэктывы аб разьмеркаваньні ўраджаю, выходзячы з колькасьці затрачаных кожным калгасьнікам працадзён тут ня прытрымліваліся. У выніку значная колькасьць калгасьнікаў атрымала ў два і тры разы больш прыбытку, чым ім сапраўды належнага. Напрыклад, член калгасу імя Леніна (Мікалаеўскі сельсавет) В. Багданаў атрымаў 657 руб., а павінен быў атрымаць толькі 289 руб.

З 54-х калгасаў лічацца пераведзенымі на зьдзельшчыну 7. У чым выявіўся перавод на зьдзельшчыну і ці правільна ацэньвалі дырэктыва—райкалгасаюз ня ведае, бо праверкі не рабіў.

У пагражаючым становішчы падрыхтоўка да будаўніцтва у калгасах. Фактычна яна яшчэ не распачыналася. Райкалгасаюзу патрэбен тэхнік будаўнік. Такога работніка няма. Неаднаразовыя просьбы да Белкалгасэнтру прысылаць тэхніка выпікаў не далі.

І зараз па Гарадоцкім раёне ганебна адстае тэмп калектывізацыі. На сёньнешні дзень калектывізавана ўсяго 11,8 проц. бядняцка-сераднянцкіх гаспадарак раёну. За час падрыхтоўкі да сяўбы арганізавалася новых 19 калгасаў, 23 ініцыятыўныя групы, 32 вярбоваючыя камісіі, але ўсё гэта не дало належнага ўедыму калгаснай хвалі, бо раённыя арганізацыі ўсё яшчэ слаба кіруюць калгасным рухам і сапраўды на чале яго ня сталі. Кулацкая агітацыя ў радзе месц не атрымлівае рашучага адпору, бо рабоце сярод беднаты здаведнай увагі не аддаецца.

Самым адстаючым вучасткам зьяўляецца падрыхтоўка да сяўбы ў індывідуальным сэктары. Насеньне ачышчана аднаасобнікамі на 56 проц. Замест 4.320 цэнтнераў страхавых фондаў сыпана толькі 526 цэнтнераў. Пасеўны плян даведзен да 82 проц. аднаасобнікаў, але ёсьць такія сельсаветы, дзе гэта заданьне выкананa ўсяго на 12 проц. (Капытэнскі сельсавет). Недапушчальна марудна ідзе рамонт інвэнтару ў індывідуальным сэктары.

Гарадоцкія раённыя арганізацыі павінны яшчэ больш напружыць свае сілы, каб у бліжэйшыя-ж дні дабіцца завяршэньня падрыхтоўкі да сяўбы. Рашуча змагаючыся з апартуністычнай практыкай раду нізавых арганізацый і сельсаветаў, мабілізуючы масы на барацьбу з кулаком, трэба дабіцца магутнага ўздыму калгаснай хвалі.

Арк. Зарубежны

Ачысьціць Барысенкі сельсавет ад кулацкіх агентаў

УВАРАВІЧЫ. (Наш кар.). БАРВЕНАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ правальвае амаль усе гаспадарча-палітычныя кампаніі. Адзай з асноўных прычын гэтага зьяўляецца тое, што ў сельсавет прапезьлі падкулачнікі, якія сыстэматычна абараняюць інтарэсы кулацка-заможных гаспадарак. Вось характэрны факт. На пленуме сельсавету стаяла пытаньне аб дачы цьвёрдых заданьняў 12 кулацка-заможным гаспадаркам.

Кулацкія падпявалы выступілі ў абарону кулаксоў. Члены сельсавету СЯРБУНОВА, БЫКОЎСКІ, РУДЗЯНКОЎ, КАЦУРА, МАЛЮЦІН, КОРЗУН антыўна абаранялі кулацкія гаспадарні і заявілі:

— Нельга наогул даваць цьвёрдых заданьняў па ўсім Берэзінскім сельсавеце.

Гэты факт выразна сьведчыць аб тым, што склад сельсавету нездаровы, што сельсавет нездольны выконваць задачы, якія ставіць перад намі партыя, што ён нездольны змагацца за выкананьне пляну гаспадарча-палітычных кампаній.

Вось другі факт. 22-III адбыўся сход сялян у пасёлку ХОЎХЛА. У парадку дня стаялі пытаньні аб кантрактацыі яравых пасеваў, стварэньні стра

ЗАЛІВАЮЧЫ ПАТОКАМІ КРЫВІ акупаваныя Зах. Беларусь і Украіну— польскі фашызм адначасова ліхаманкава падрыхтоўвае ўзброены напад на СССР

Фэдаралістычныя лёзунгі ў інтэрвэнцыяністкіх плянах польскага імпэрыялізму

V-ты з'езд кампартыі Польшчы ў сваёй рэзалюцыі па нацыянальным пытаньні адзначыў: «Фашысцкая Польшча зьяўляецца фарпостам міжнароднага імпэрыялізму ў яго барацьбе супроць СССР. Палітыка польскай буржуазіі ў адносінах да украінскіх, беларускіх і літоўскіх рабочых з моманту стварэньня польскай дзяржавы выразна імпэрыялістычны характар, які зьяўляецца выкінутым клясовых інтарэсаў усёй польскай буржуазіі, у першую чаргу, фінансавага капіталу, прамысловасьці і абшарніцтва».

Палітыка польскага імпэрыялізму на Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне падпарадкавана яго ваеннай палітыцы. IV пленум ЦК КПЗБ правільна падкрэсьліў, што на ЗВ асабліва выразна праяўляюцца ваенныя мэты ў нацыянальнай палітыцы фашысцкага ўраду.

У падрыхтоўцы да новай вайны, як да выхаду з крызыснага становішча, якое перажывае фашысцкая Польшча, імпэрыялісты актыўна выкорыстоўваюць і папулярызуюць так званыя фэдаралістычныя лёзунгі. Побач з грубай палянізацыяй і тэрорам, побач з палітыкай калёнізатарства і эксплёатацыі, польскі фашысцкі рэжым падчас імкнецца ўмацаваць сваю клясавую базу ў акупаваных абласьцях, увядзіўшы саюз з буржуазіяй і кулацтвам прыпечатных народаў. Польскі імпэрыялізм ужываецца карыстаецца сацыяльнай і нацыянальнай дэмагогіяй, каб прадказаць сябе як пойскага амэбіо на Ўсходзе і побач з варыянтам экспансыянскім, побач з сыстэмай Луцку і Ліды, высоўвае лёзунг фэдэрацыі Польшчы з буржуазнай Беларусьсю і Украінай, як пёзунг эвэйны, як лёзунг ірка зитысавецкі.

Ва ўсёй падрыхтоўчай работе польскіх імпэрыялістаў да новых ваенных авантур, гэтыя лёзунгі фэдэрацыі граюць немаловажную ролю, як палітычныя лёзунгі вайны супроць БССР і УССР. Польскі імпэрыялізм імкнецца падпяваціць БССР і УССР, ператварыць іх у свае калёніі, каб гэтым самым вырашыць унутраныя цяжкасьці і супярэчнасьці, каб практычна ажыцьцявіць пляны сваёй экспансіі на Ўсход.

Пад лёзунгамі фэдэрацыі польскі імпэрыялізм умацоўвае адзіны фронт польскай, беларускай і украінскай буржуазіі ў справе барацьбы супроць СССР і супроць нацыянальна-вызвольнага руху на ЗВ і ЗУ. Па сваёй сутнасьці гэтыя лёзунгі вытыкаюцца сынонімам пёзунгу «Польшча эд мора да мора», не выходзілі з праграмных установак і афіцыйнай лініі заможнай палітычнай імпэрыялістычнай Польшчы за ўвесь час яе існаваньня.

У 1920 г. Пілсудскі, арганізоўваючы ваенны імпэрыялістычны паход на Кіеў і Менск, многа дэкламаваў на тэму аб «вольных з вольнымі», падмацоўваючы гэтую дэкламацыю радамі шасьці, шматлікімі палявымі судамі і палітычнай трубай акупацыі ў адносінах да шырокіх мільённых мас рабочае клясы і працоўнага сялянства. Гэта дэкламацыя ўвенчалася лёзунгам фэдэральнай Польшчы, якая па думцы Пілсудскага аб'ядналa-б пад сваім пратэкторатам Беларусь і Украіну. Зразумела, што і тады гэтая балбатня аб саюзе «вольных з вольнымі» павінна была прыкрываць яраж імпэрыялістычную, калёніятарскую і акупацыйную палітыку польскай буржуазіі.

І зараз, калі польскі імпэрыялізм з незакаванай актыўнасьцю рыхтуецца да новых ваенных авантур, гэтая-ж самая дэкламацыя і гэтыя лёзунгі ўсё больш актыўна падкрэсьліваюць польскімі фашыстамі.

Польскія імпэрыялісты ў ваенных мэтах падтрымліваюць і натхняюць контрэвалюцыйную работу на тэрыторыі заходнія-беларускіх нацыянал-фашыстаў. Яны актыўна падтрымліваюць і натхняюць шкодніцкую, контр-рэвалюцыйную работу і беларускіх нацдэмаў. Як агульную палітычную плятформу для адзінага контр-рэвалюцыйнага саюзу польскія фашысты і ў гэтым падтрыманьні беларускіх нацдэмаў узмоцнена высоўваюць сваю імпэрыялістычную праграму стварэньня Польшчы «ад мора да мора» —праграму «фэдэрацыі».

Прыхаваныя самых арыштаваных беларускіх нацыянал-дэмакратаў падкрэсьліваюць ясна і выразна іх ролю як агентаў інтэрвэнцыі, як агентаў **польскага імпэрыялізму.** Іх прызнаньні выкрываюць інтэрвэнцыяністкія пляны і бліжэйшую контр-рэвалюцыі і польскага імпэрыялізму. Яны паказваюць, што іх праца на падрыхтоўцы спрыяючай глебы для інтэрвэнцыі па сутнасьці выходзіла з тых палітычных дырэктыў, якія яна атрымлівала ад польскіх імпэрыялістаў. Адзін з нацыянал-дэмакратаў расказвае, што ўжо пасьля польска-савецкай вайны, калі беларускія нацыяналісты стварылі бутафорскі ўрад так званай «БНР», А. Цьвікевіч і Луцкевіч былі ў Варшаве, дзе яны бачыліся з Пілсудскім. Ён расказвае аб сутнасьці гэтай размовы і зьмесьце тых дырэктыў, якія ў часе гэтай размовы даў Пілсудскі. Пілсудскі гаварыў наступнае:

«Дзеля таго, каб паміж мною і прадстаўнікамі беларускага нацыянальнага руху ўстанавіўся неабходны кантакт і каб апошні мог разьлічваць на мае падтрыманьне, НЕАБХОДНА ПОЎНАСЬЦЮ ПРЫЗНАЦЬ ПОЛЬСКУЮ ДЗЯРЖАВУ, ПАДПАРАДКАВАЦЦА ПОЛЬСКАЙ УЛАДЗЕ І СПЫНІЦЬ ГУТАРКІ АБ НЕЗАЛЕЖНАСЬЦІ БЕЛАРУСІ»...

У гэтай частцы дырэктывы польскіх імпэрыялістаў беларускім нацыяналістам, з усёй адкрытасьцю фармулюецца сапраўдная сутнасьць прыгожых фраз аб саюзе «вольных з вольнымі», сутнасьць усіх ашуканчых мараўраў, разьлічаных на тое, каб адарыентаваць беларускія працоўныя масы і разьбіць іх рэвалюцыйны рух. Справа стаіць ясна—поўнае падпарадкаваньне буржуазнай Польшчы, работа пад яе камандай, адмаўленьне ад усякіх гутарак аб незалежнасьці, што знайшло поўнае адлюстраваньне ўзрадзіцкай дэкларацыі Астроўскага па «Чарнэй-лаве» у Кіртыкліса.

«Я пічу,—гаварыў далей Пілсудскі,—што задачы Польшчы заключаюцца ў вызваленьні Беларусі ня толькі ад палітычнага панаваньня Расіі—бальшэвіцкай, царскай, альбо дэмакратычнай—гэта ўсё роўна, але і ад уплываў рускай культуры. Расія наш агульны вораг, незалежна ад формы яе праўленьня, вораг гістарычны, гэты вораг павінен быць разьбіты на ўсіх франтох, у тым ліку і на культурным. Задача беларускіх дзеячоў заключаецца ў тым, каб апіраючыся, арыентуючыся на Захад, на заходнюю культуру, пад пратэктаратам Польшчы,—ліквідаваць усе сьляды ўплыву рускай культуры, якія прышчэплены Беларусі ў мінулым, і як мага больш зблізіць беларусаў з палякамі... Вы павінны дапамагчы мне накіраваць беларускі рух у неабходнае рачышча, каб ён служыў агульнай справе —умацаваньня нашай маладой дзяржавы—Польскай Жэчы Паспалітай, каб ён служыў умірытаваньню «усходніх крэсаў», перад усім сялянствам, умацаваньню ў Беларусі польскай улады, якая абаронае Беларусь ад бальшэвіцкага барбарства. Апроч таго, БЕЛАРУСКІЯ ДЗЕЯЧЫ ПАВІННЫ ГАРАНТАВАЦЬ ГЭТАЙ ПОЛЬСКАЙ УЛАДЗЕ НЕ НА СЛОВАХ, А НА СПРАВЕ, БАРАЦЬБУ З СВАЙГО БОКУ З БАЛЬШАВІКАМІ».

У гэтай гутарцы зусім ясна сфармулявана імпэрыялістычная праграма польскай буржуазіі і тая падстава, на якой яна ўмацоўвала і ўмацоўвае свой саюз з беларускай буржуазіяй. Гэтай праграмай зьяўляецца барацьба супроць сацыялістычнай савецкай краіны, барацьба з уплывамі з Усходу, барацьба з бальшавізмам. Разгаворы аб «Расіі» ідуць у зусім канкретных палітычных абставінах, калі на фоне старой царскай Расіі, а калі ідзе вольны сацыялістычны саюз вольных савецкіх народаў, і таму гэтыя разгаворы ў перавоце на палітычную мову сучаснасьці азначаюць у вуснах польскіх імпэрыялістаў **прапаганду вайны супроць СССР і падрыхтоўку гэтай вайны.** І ёмкіна для ваенных мэт, прадохтоўкі польскага імпэрыялізму разьць беларускім нацыяналістам цялам падпарадкаваецца буржуазнай Польшчы і суміленна выконваць сваю ролю нагаі рэвалюцыйнага руху на Заходняй Беларусі і актыўнага, радзічнага атраду ў барацьбе супроць бальшавіцкіх уплываў, якія ідуць ад БССР.

Арыштаваныя беларускія нацдэмы паказваюць, што такія-ж самыя дырэктывы давяліся і іншым прадстаўнікам польскіх абшарнікаў і фабрыкантаў. Так, напрыклад, Мэйштовіч, які быў у свой час віленскім ваяводай, гаварыў з Краскоўскім на тэму аб саюзе паміж польскай і беларускай буржуазіяй і, як паказае адзін з арыштаваных, «абіцаў падтрыманьне і апеку». У гэтым самым духу гаварыў у свой час Кавецкі—былы начальнік дэфэнзывы ў Вільні, Манькоўскі і інш.

Па жні гэтых асобных дырэктыў ішла на сутнасьці інтэрвэнцыяністкая дзейнасьць нацыянал-дэмакратаў і ідзе зараз інтэрвэнцыяністкая дзейнасьць нацыянал-фашыстаў у Заходняй Беларусі. З аднаго боку—высоўваньне лёзунгу «фэдэрацыі», з другога—цынічна адкрытая праграма сумесных дзеянняў польскага імпэрыялізму і беларускай буржуазіі ў справе стварэньня імпэрыялістычнай Польшчы «ад мора да мора», у справе назавсёды **БССР і ператварэньня яе ў калёнію польскага капіталу.**

Лёзунг «БНР», які высунулі ў свой час беларускія нацыяналісты, і ідэя ім яны вялі ўсю сваю контр-рэвалюцыйную шкодніцкую працу, быў і ёсьць, у канкретных палітычных умовах, калі так можна выразіцца, **ператлумачэньнем пёзунгу Польшчы «ад мора да мора» на мову беларускіх інтэрвэнтаў. Гэты пёзунг быў і ёсьць пераносам на нацдэмаўскі пад—фэдэралістычных сьпеваў польскага імпэрыялізму.**

IV пленум ЦК КПЗБ, паміж іншым, адзначыў, што «беларуская буржуазія, у тым ліку кулацтва, буржуазная інтэлігэнцыя, духавенства мае свае ўласныя клясовыя інтарэсы, адзнак, яна добра разумее, што без польскага і міжнароднага капіталу яна бязсільна ў барацьбе супроць пралетарыяту і яго кампартыі». І таму «ў імя сваіх клясавых інтарэсаў і дзеля звалення пралетарскай дыктатуры ў БССР, яна канцэнтрує свае сілы пад камандай польскага фашызму супроць сацыялістычнай рэвалюцыі ва ўсёй Польшчы і на падрыхтоўку вайны супроць СССР, выдаткуючы ўсё большую агрэсыўнасьць у адносінах да БССР».

Калі мы возьмем увесь апошні перыяд контр-рэвалюцыйнай працы беларускіх нацдэмаў, то яна імкнула выходзіла з гэтай арыентацыі перш за ўсё на польскі імпэрыялізм і як бачым, выконвала дырэктывы яго на падрыхтоўцы неабходных умоў для новай антысавецкай інтэрвэнцыі. Нацдэмы прызнаюць, што ўся іх шкодніцкая, контр-рэвалюцыйная праца выходзіла з сумленнага выкананьня дырэктыў польскіх імпэрыялістаў і, што тое выкананьне ішло на лініі клясавых інтарэсаў і самой беларускай буржуазіі.

Лёсік гаварыць у сваіх паказаньнях:

«У пачатку нашай дзейнасьці ў нас востра стаяла пытаньне аб палітычнай арыентацыі. Беларусь слабая, важна сувязь з моцным палітычным арганізмам, на каго арыентавацца—на Расію альбо на Польшчу... Наша нацыянальнае ратаваньне—незалежная беларуская рэспубліка, у сувязі з Польшчай, але не з Масквой».

Але як паміма была выпладаць гэтая «незалежнасьць» беларускай рэспублікі, гаварыў ужо вышэй Пілсудскі і гаворыць у сваіх прызнаньнях Некраш:

«Цьвярозыя палітыкі лічылі, што яна («БНР») павінна быць цесна зьвязана з Польшчай, якая толькі і можа захаваць яе суверэнітэт».

Няма патрэбы гаварыць аб сутнасьці гэтага «суверэнітэту». Польскія імпэрыялісты і заходня-беларускія нацыяналі-фашысты, (успомнім даклады Астроўскага на сходзе паслоў урадовага блёку) таксама, як і беларускія нацдэмы ясна расшыфроўваюць зьмест гэтага «суверэнітэту». **Падпарадкаваньне камандзе буржуазнай Польшчы, зьяднаньне БССР, ажыцьцяўленьне на справе фэдэралістычных, імпэрыялістычных лёзунгаў польскага фашызму** —вось сутнасьць гэтых гутарак аб «суверэнітэце».

Усе падзеі апошняга часу гаворыць, што на гэтай самай лініі, аб якой гаварылася яшчэ ў 1921 г., ідзе ўся падрыхтоўчая ваенная праца польскага фашызму і яго варыянта саюзьніка беларускага нацыянал-фашызму і ў сучасны момант.

Нам прыходзілася ня раз пісаць аб практыкаваньнях Тадэўша Галуцка ў «фэдэралістычнай» дзейнасьці. Яго выступленьне на трыбуне польскага сойму, яно прамовы на апошняй нарадзе фашысцкіх паслоў у Вільні, працягваюць у новых умовах тое, гаварыў Пілсудскі, адрэсьліваючы лінію паводзін беларускіх нацыяналістаў. Мы водзем таксама і аб выступленьнях Астроўскага, які ў сучасных умовах стараніна выконвае гэтыя дырэктывы сваіх гаспадароў. Таксама, як і яго хаўрусьнікі беларускія нацдэмы, ён адкрыта дэкляруе прыхаваныя польскай акупацыяй улады. Нядаўна яго сторонкіх «Кур'ера Віленскага» зьмяшчаўся рад прадказьдзіных «ставядамленьняў», інспіраваных дефэнзывай і 2-м аддзелам польскага генштабу, дзе адкрыта прапагандуецца адрыў БССР ад Савецкага Саюзу, дзе ўзмоцнена папулярызуюцца «фэдэралістычныя» лёзунгі і зусім недвухсэнсоўна падтрымліваецца контр-рэвалюцыйная праца беларускіх нацдэмаў.

Усе гэтыя канкретныя факты паказваюць, што польскія імпэрыялісты, **заліваючы патокамі крыві акупаваныя землі Заходняй Беларусі і Украіны,** адначасова з гэтым умоцнена вядуць разгорнутую працу ў справе арганізацыі новых ваенных авантур. Як кампанія супроць «савецкага дэмпінгу», супроць «прымусовай працы», так і байкі аб «праследваньнях беларусаў у БССР, так і фэдэралістычныя мары і лёзунгі польскіх авантурыстаў зьяўляюцца зброяй з аднаго і таго-ж арсэналу. Імя гэтаму арсэналу—палітычная падрыхтоўка антысавецкай інтэрвэнцыі.

Польскі друк любіць часта рабіць зьдзяўлёны твар, калі ён піша аб абвінавачваньнях з боку савецкай грамадзкасьці ў тым, што польскія імпэрыялісты вядуць небезпекотную, інтэрвэнцыяністкую гульню. Але гэта толькі адзін з нацыфіцыцкіх маневраў польскіх газэт. Справа Пальчэўскага паказала, што польская буржуазія і кіруючая фашысцкая кліка ня толькі не пазбудзе сваіх інтэрвэнцыяністкіх плянаў, але працягвае ўсё больш актыўна рыхтавацца да іх ажыцьцяўленьня. І адным з паказальнікаў гэтага зьяўляецца актывізацыя польскага фашызму ў справе высоўваньня ідэй фэдэрамізму, як ідэй стварэньня Польшчы «ад мора за мора», як ідэй антысавецкіх, яркі імпэрыялістычных, як плянаў вайны.

Працоўныя нашай савецкай краіны будуць напагатове і ўзброя авантура з боку польскіх імпэрыялістаў кончыцца для іх поўным правалам.

А. Альшэўскі.

БАЯЗДОЛЬНАСЬЦЬ ЗМАГАЦЦА ЗА ГЕНЭРАЛЬНУЮ ЛІНІЮ ПАРТЫІ

павінна давесьці кожная вясковая парт'ячэйка сваёй ударнай работай па выкананьні праграмы другой калгаснай вясны

Трэба дабіцца сапраўднага пералому ў рабоце

ЖУРАВІЦКІ райком партыі ПРАВЕЎ ШЫРОКУЮ САМАПРАВЕРКУ РАБОТЫ ЯЧЭЕК КП(б)Б. Гэтай праверкай выяўлена шмат вельмі істотных недахопаў у рабоце некаторых ячэек, а ў радзе выпадкаў яўная праваапартуністычная практыка.

Ячэйкі слаба праводзяць работу па калектывізацыі сельскай гаспадаркі і падрыхтоўкі да весьнавой сяўбы. Наглядаюцца выпадкі недаацэнкі работы з беднатой. Апартуністы з ІСКАНСКАЙ ячэйкі разважаюць аб тым, што зараз ніякай работы з беднатой ня трэба праводзіць. За гэтымі разважаньнямі ідуць канкрэтныя справы голага адміністраваньня.

Апартуністычнае ігнараваньне работы з беднатой і наогул недаацэнка масавай работы сярод аднаасобнікаў бядняцка-серадняцкага сялянства дае свае адмоўныя вынікі. Такое становішча вельмі рэзка вызначалася ў правядзеньні загатовак. Слабую работу з боку некаторых ячэек па арганізацыі калгаснікаў і бядняцка - серадняцкіх аднаасобных мас на выкананьне задач партыі выкарыстоўвае кулацтва. Пастановы агульных сходаў сялян у радзе населеных пунктаў па пытаньні загатовак ясна паказваюць кулацкі ўплыў на ход гэтых сходаў, якія ня былі забясьпечаны кіраўніцтвам парт'ячэек.

У рабоце парт'ячэйкі, якая абслугоўвае калгасы імя СТАЛІНА і «ДРУЖБА», апартуністычная практыка ўвайшла ў сыстэму. Наперакор дырэктывам партыі і ўраду аб разьмеркаваньні ўраджаю па прынцыпе працадня, адпаведна затрачанай колькасьці і якасьці працы ў калгасе, аплата працы і зараз праводзіцца па ядоцкім прынцыпе, што зьяўляецца асноўнай перашкодай для ўзмацненьня працоўнай дысцыпліны ў калгасе і новага калгаснага прыпіву. Партыйцы, якія працуюць у гэтых калгасах, не падаюць узорных прыкладаў у рабоце, не зьяўляюцца застрэльшчыкамі разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Праўленьне калгасу імя Сталіна адмаўлялася прымаць у калгас беднякоў, а кулакам і заможнікам былі шырока адкрыты дзьверы.

Абмяркоўваючы на праўленьні калгасу пытаньне аб падрыхтоўцы да сяўбы цягавай сілы, апартуніст ІЛЬЛЕЎ дагаварыўся да таго, каб разабагуліць рабочую жывёлу, матывуючы тым, што ў індывідуальным парадку коні лепш будуць дагледжаны калгаснікамі. Гэтай кулацкай ідэалёгіі, накіраванай па сутнасьці на разбурэньне калгасу, партячэйка не дала рашучага адпору.

Журавіцкі райком рашуча ўдарыў па канкрэтных носьбітах кулацкай ідэалёгіі, выключыўшы з партыі яўных апартуністаў. Для ўзмацненьня работы па падрыхтоўцы да весьнавой сяўбы і калектывізацыі, накіравана ў сельсаветы на пастаянную работу 17 проц. раённага актыву.

Самаправерка зьявілася значным штуршком у справе ажыўленьня работы ячэек па выкананьні задач другой калгаснай вясны. У гэтай справе трэба дабіцца сапраўднага пералому, сапраўдных бальшавіцкіх тэмпаў.

В. РАБЦОЎ.

Бязьлітасна ламаць кулацкае супраціўленьне

Практычнае ажыцьцяўленьне задач партыі па сацыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі і ліквідацыі кулацтва як класы на аснове суцэльнай калектывізацыі, выжлівае актыўнае супраціўленьне кулацкіх элементаў. Кулацтва разьвівае шалёную агітацыю супроць усіх мерапрыемстваў партыі, якія праводзяцца на вёсцы і ўсякімі мерамі імкнецца зрабіць свой уплыў на найбольшы адсталую частку серадняцкай і беднякоў.

У **Ветрынскім** рабне за апошні час моц месца выпадкі пераходу кулацкіх элементаў ад варожай агітацыі да проставга тэрору. У **Руднянскім** і **Бабыніцкім** сельсаветах кулакамі падпалены калгасныя будынкі, у якіх знаходзіліся збожжа і сельска-гаспадарчыя машыны.

На сход бедноты вёскі **Валетаўка,** дзе праводзіў сакратар парт'ячэйкі па пытаньні аб калектывізацыі, **уварвалася група падпупачнікаў з мэтай разагнаць сход. Калі сакратар ячэйкі прапанаваў ім пакінуць сход, гэтыя кулацкія элементы накінуліся на яго і пагражалі забойствам але беднота не дапусьціла расправы разьюшанага кулацтва над партыйцам.**

Зараз гэтыя кулацкія элементы арыштаваны, бядняцка-серадняцкае сялянства выносіць на сваіх сходах рэзалюцыі, у якіх патрабуе самай жорсткай бязьлітаснай кары кулакам-тэрарыстам.

Партыйныя ячэйкі Ветрынскага раёну павінны яшчэ больш узмацніць сваю работу сярод бядняцка-серадняцкіх мас вёскі па калектывізацыі, мабілізуючы іх на бязьлітасную барацьбу з кулацтвам, на канатковае перамаганьне супраціўленьня клясавага ворага калгаснаму будаўніцтву.

Ю. З.

Калгасны прылёў павялічваецца

Вендарская ячэйка КП(б)Б (Магілеўскі раён) па-бальшавіцку разгарнула работу сярод аднаасобнікаў па ўцягненьні іх у калгасы. Правільная расстаноўка партыйных сіл, сыстэматычная работа сярод бядняцка-серадняцкіх мас сялянства дала свае станоўчыя вынікі. Калгасны прылёў усё павялічваецца. Беднякі і сераднякі аднаасобнікі на вопыце існуючых калгасаў пераконваюцца ў перавагах буйной арганізаванай гаспадаркі перад дробнай аднаасобнай. Зараз у калгасы аб'яднана звыш 50 проц бядняцка-сераднякіх гаспадарак сельсаветаў.

Значным недахопам у рабоце ячэйкі зьяўляецца тое, што неадлежна патрэбная ўвагі гаспадарчаму замацаваньню наваарганізаваных калгасаў. Нельга прызнаць вдавальняючай работу па падрыхтоўцы да весьнавой сяўбы. Засыпка насенных фондаў, ачыстка насеньня, рамонт інвентару і інш. праводзіцца марудным тэмпам. Ячэйка слаба праводзіць работу па кантрактацыі. У гэтай рабоце дапушчаны скажэньні дырэктыў партыі і ўраду, у некаторых мясцовых работнікаў няма правільнага разуменьня як значэньня кантрактацыі, так і парадку яе правядзеньня. У пасобных вёсках закантрактаваны ўсе насевы, а ня яўная таварная частка яравых культур. Гэтыя недахопы ячэйка павінна неадкладна выправіць.

Друцкі.

Полацкая райКК стала на шлях заціску самакрытыкі

У студзені гэтага году газэта «Чырвоная Полаччына» зьмясьціла допіс рабкора тав. **Сачыўка** аб становішчы ў саўгасе «Палата». У допісе падраблана расказвалася як галаваціп-апартуніст загадчык саўгасу **Вялюга** вядзе гаспадарку да поўнага распаду ў цесным саюзе з кулацтвам і папом, які жыве на тэрыторыі саўгасу.

У мінулым годзе засталося няўбраным з поля некалькі тысяч пудоў сена. Вакольнае сялянства не адзін раз зьвярталася да загадчыка саўгасу з прапановай скасіць сена на поўных умовах, але Вялюга знайшоў больш мэтазгодным пакінуць сена пад сьнегам.

У саўгасе пад апекай Вялюгі два сыны папа набылі кваліфікацыю трактарыстаў і былі залічаны ў штат. Ня гледзячы на пратэсты рабочых, поп атрымаў дом, які прызначаўся для фэльчарскага пункту, кулакі Сідаравы, Сініцыны, Шабалавы, Бабковы, Сюбары і іншыя знайшлі ў саўгасе ня толькі прытулак, але і кіруючую работу.

Апрача гэтага ў заметцы падаваўся рад фактаў, якія выразна гаварылі за тое, што кіраўніцтва саўгасу трэба тэрміново зьняць як апартуністычнае і пяздольнае змагацца за пасьпяховае разьвіцьцё гаспадаркі.

«Чырвоная Полаччына» зрабіла зусім правільны вывад, зьмясьціўшы матар'ялы рабкора Сачыўка. Газэта пісала:

«Гэтыя злачынныя факты не патрабуюць падрабязных каментараў, яны гавораць самі за сябе. Без канца скрыўляючы клясавую лінію пад папоўскую і кулацкую дыктоўку, Вялюга, да рэчы кажучы былы загадчык полацкага акрэа, упарта ня хоча падпарадкавацца пастановам партыі і савецкай улады. Нам здаецца, што РСІ і пракуратура неадкладна спыняць злачынную дзейнасьць гэтага рыцара кулацкай практыкі.»

Пасьля зьмяшчэньня выкрываючых матар'ялаў рэдакцыя газэты **«Чырвоная Полаччына» на працягу двух месяцаў да магалася рэагаваньня з боку РайКК РСІ на становішча ў саўгасе «Палата».** Пачалося з таго, што рэдакцыя накіравала заметку ў КК РСІ, апошняя катэгарычна адмовіўшыся ад расьсьледваньня, накіравала яе ў РВК. **Заметка дасылалася з установы ва ўстанову пэкуль ня трапіла на расьсьледваньне... аўтару.**

Сачыўка абураны зьявіўся ў рэдакцыю. Рэдакцыя зноў пачала катэгарычна патрабаваць тэрміновага расьсьледваньня заметкі. Нарэшце раённыя арганізацыі ня стрымалі і паслалі ў саўгас агента Крымвышуку для азнаямленьня са становішчам саўгасу, для праверкі фактаў аб сувязі Вялюгі з сацыяльна-варожым элементам.

Нам невядома якія вывады былі напісаны агентам Крымвышуку, але вядома што ўпартая рэдакцыя працягвала дабівацца рэагаваньня на заметкі. Нарэшце была створана камісія.

Камісія не знайшла патрэбным гаварыць з рабочымі саўгасу, з бядняцка-сераднякім ваколічным сялянствам, якое добра ведае сапраўднае становішча ў саўгасе. Камісія за чашкай чаю з Вялюгі расьсьледвала справу... аб правай практыцы кіраўніка саўгасу.

І, як трэба было чакаць, камісія са слоў Вялюгі запісала, што саўгас зьяўляецца сапраўды ўзорам, што яго кіраўнік рэдкі чалавек, вытрыманы, самаадданы правільна праводзіць лінію партыі. Камісія ў сваіх вывадах не пашкадавала памыяў і з вялікім мастацтвам вымла іх на галаву рабкора Сачыўкі, запісаўшы, што такому чалавеку, як Сачыўка нельга верыць, бо ён толькі і робіць, што на кожным кроку хлісьціць — (?!) — і за хлусьню атрымлівае грошы.

7 сакавіка прэзыдыум Полацкай РайКК, заслухаўшы вывады камісіі па справе Вялюгі, прыняў пастанову, у якой шмат гаворыцца аб неабходнасьці разгортваньня ў раёне сапраўды бальшавіцкай самакрытыкі, аб мабілізацыі мас... Але, як гэта ня прыкра, прэзыдыум РайКК галасуючы за разгортваньне самакрытыкі, у той-жа час отаў на шлях самага ганебнага, злачыннага заціску самакрытыкі, прызнаўшы, што

«Зьмешчаная заметка ў «Чырвонай Полаччыне» пад назвай «Злачынства ў саўгасе «Палата» зьяўляецца ўчынкам кулацкай часткі, якая скарыстала ў даным выпадку «Чырв. Полаччыну» на поўную кампраметацыю кіраўніцтва і праводзімых мерапрыемстваў па разьвіцьці саўгасу.

Прызнаць, што факты, выкладзеныя ў заметцы «Злачынства саўгасе «Палата», якая зьмешчана ў «Чырвонай Полаччыне», не пацьвердзілася за выключэньнем таго пункту, які датычыць невысьленьня з тэрыторыі саўгасу папа Аніксева, ня гледзячы на тое, што тав. Вялюга на раз ставіў пытаньне перад РВК аб найхутчэйшым высьленьні папа...»

Пастанова ад першага да апошняга радка выгараджвае Вялюгу, абараняе, аправдваючы яго апартуністычную дзейнасьць, сувязь з кулацтвам, наводзіць паклёпы на рабселькораўскі рух, заціскае рэдакцыю газэты «якая па-бальшавіцку выкрыла злачынства ў саўгасе «Палата».

Падкрэсьліўшы, што заметка зьяўляецца вылазкай клясавага ворага ў партыйна-савецкім друку, РайКК ў другім пункце пацьвердзіла правільнасьць заметкі.

«Паставіць пытаньне перад РВК аб высьленьні з тэрыторыі саўгасу кулацкага элемэнта (Бабкоў, Казлоў, Шабанаў, Сюбар і Барацоў»).

РайКК не знайшла ў саўгасе шкодніцтва, правай практыкі, заціску самакрытыкі крыцэнапаўскім эфрэйтарам Валюгай, не знайшла, што саўгас знаходзіцца на шляху развалу.

Мы вымушаны яшчэ прыведзьці адну выпытку з пастановы РайКК, якая больш не пакідае ні на хвіліну сумненьня ў тым, што Полацкая КК бюракратычна падышла да вырашэньня гэтага пытаньня.

«Прызнаючы, што заметка пад назвай «Злачынства ў саўгасе «Палата» не пацьвердзілася (за выключэньнем пункту, які датычыць невысьленьня папа з тэрыторыі саўгасу), а фактычна была накіравана кулацка-заможнай часткай на падрыў становішча саўгасу і па дыскрэдытацыю кіраўніцтва, што з боку рэдакцыі «Чырвонай Полаччына» была зьмешчана гэта заметка, якая не адпавядае сапраўднасьці і без папярэдняй праверкі (?), за што рэдактару вынесьці вымову».

Пастанова, мякка гаворачы, зьяўляецца прыкладам палітычнай сьлепаты, прытупленьня клясавай пільнасьці, адбівае імкненьне апартуністычных элементаў заціскуць самакрытыку, разгаміць рабселькораўскі рух, прымусіць партыйна-савецкі друк адмовіцца ад рашучага ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі па пытаньні разгортваньня пралетарскай самакрытыкі.

28 сакавіка райКК яшчэ раз вярнулася да саўгасу «Палата» і яшчэ раз вынесла пастанову, якая ад першай адрозьніваецца толькі тым, што ў пастанове знаходзіць **пацьвярджэньня раду фактаў, што прыводзіліся рабкорам Сачыўка.** Палітычная ацэнка сутнасьці падзей у саўгасе засталася ў мінулай рэдакцыі...

Мы атрымалі ліст з Полацку, у якім рабкор паведамляе нас, што на тав. Сачыўку заведзена судовая справа на абвінавачаньні яго ў контр-рэвалюцыйнай дзейнасьці...

Пастановы Полацкай райКК па сутнасьці зьяўляецца пячэнным фактам **прасьледваньня актыўнага рабкора, заціску самакрытыкі і абароны правапартуністычнай практыкі пасобных камуністаў.**

Мы патрабуем тэрміновага ўмяшаньня адпаведных органаў у справу рабкора Сачыўка. Апартуністы з Полацкай райКК павінны быць крыцэнкуты да самай суровай партыйнай адказнасьці.

Ул. Эль.

Супроць крывавай оргіі фашысцкай апрычніны

Пратэст мільёнаў

Працоўныя Зах. Беларусі, цясьней рады вакол КПЗБ

Фашысцкая Польшча, якая задыхаецца ў цісках палітычнага і эканамічнага крызысу, шукае выхад за ўзброеная інтэрвэнцыя супроць СССР. Але магутны нацыянальна-вызвольны рух на Заходняй Беларусі і Зах. Украіне, які ўсё больш і больш узмацняецца, адсоўвае тэрміны злачынных плянаў фашысцкіх інтэрвэнтаў.

Новая хваля крывавага тэрору польскіх акупантаў набывае нячуваныя зьверскія формы. Разгром ПНС-ляўцы, Беларускага работніцка-сялянскага клюбу «Змаганьня», шматгадовыя катаржныя прысуды над паслямі гэтага клюбу, арышт тав. Тарашкевіча, разгром Таварыства Беларускай Школы і канфіскацыйных устаноў працоўнага сялянства, **катаваньні і забойствы ў Слонімскай, Кобрынскай, Лідзкай і інш. аховах** лепшых пралетарыяту і працоўнага сялянства — ня можа ня выклікаць глыбокага пралетарскага абурэньня.

Мы, рабочыя, работніцы і адміністрацыйны персанал саўгасу «Камінтэрн» пратэстуем супроць крывавага тэрору польскага фашызму і заяўляем, што ў адказ фашысцкім акупантам яшчэ больш узмоцнім барацьбу за выкананьне прамфінпляну, супроць прагулаў, за ўдзельнічыму, за зьніжэньне сабекошту, мы аддамо ўсе сілы на ўзмацненьне абароназдольнасьці СССР — бацькаўшчыны сусьветнага пралетарыяту. Адначасова ўносім на пабудову дырыжабля «Клім Варашылаў» 87 руб.

Далоў фашысцкіх акупантаў!

Няхай жыве камуністычная партыя Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіны!

Няхай жыве Камінтэрн — штаб сусьветнай рэвалюцыі!

Падпальшчыкі новай крывавай бойні пралічацца

Агульны сход аршанскага подтэхнікуму і падкурсаў адзначае, што фашысцкая Польшча, ажыцьцяўляючы пляны сусьветнага імпэрыялізму зноў працягвае свае агідную лапу на Саветкі Саюз, выхуе вайну супроць першай у сьвеце пралетарскай дзяржавы. Польскі фашызм пры актыўнай дапамозе беларускіх і украінскіх сацыял і нацыянал-фашыстаў сыстэматычна чыніце пагромы нацыянальна-вызваленчага руху.

Крывавая оргія фашысцкага тэрору ў Польшчы, разгром беларускіх школ, беларускага работніцка-сялянскага клюбу «Змаганьня», арышт Тарашкевіча, пагромы ў Заходняй Беларусі і Зах. Украіне — усё гэта гаворыць аб тым, што польскі фашызм ідзе рашуча да зьдзейсьненьня сваіх злачынных інтэрвэнцыяністкіх плянаў.

Мы, студэнты і настаўнікі, рашуча пратэстуем супроць палітыкі дзікага белага тэрору, супроць падрыхтоўкі польскім фашызмам узброенага нападу на краіну пралетарскай дыктатуры. Мы заклікаем усе працоўныя масы Савецкага Саюзу далучыць свой голас пратэсту супроць падбухторшчыкаў новай бойні.

У адказ на тэрор фашысцкіх акупантаў мы яшчэ мацней згуртуем свае рады вакол панінскай партыі І аддамо ўсе сілы на пабудову фундамэнту сацыялістычнай эканомікі, на ўзмацненьне абароназдольнасьці краіны саветаў. Адначасова абяцаем яшчэ больш узмацніць работу МОПР'у, уступаючы на ўсе 100 проц. у яго рады.

Сьмерць правакатарам і падпальшчыкам новых крывавых войн, накіраваных супроць СССР!

Няхай жыве Камінтэрн — штаб сусьветнай рэвалюцыі!

Няхай жыве рэвалюцыйнае змаганьне працоўных мас Зах. Беларусі, Зах. Украіны і Польшчы!

Няхай жыве КПП!

Замежныя рабочыя дэлегацыі—на першамайскія ўрачыстасьці ў СССР

МАСКВА, 15. Камісія замежных зносін УЦСПС атр

Выкрываць і дашчэнту разьбіваць чудзінаўшчыну

Ударыць па вялікадзяржаўных настроях

У м. Смалянцы, Кохапаўскага раёну, з мінулым годзе адкрыўся тэхнікум сацыялістычнага земляробства. Тэхнікум павінен рыхтаваць спецыялістаў па абожжавых культурах. Праца ў тэхнікуме пастаўлена дрэнна. Самакрытыка і крытыка работы сярод студэнцтва разьвіта слаба. Беларусізацыя ў тэхнікуме пастаўлена дрэнна. Дырэктар тэхнікуму Кандрацько ў часе месячніка беларусізацыі абмежаваўся афіцыяльнай абвесткай аб узмацненьні беларусізацыі. Ніякай-жа практычнай работы ў гэтым напрамку не вялося. І ня дзіва, што і пасьля месячніка беларусізацыі амаль усесь настаўніцкі пэрсанал тэхнікуму дрэнна ведае беларускую мову і рэдка карыстаецца ёю ў сваёй практычнай рабоце. Асабліва не прызнае беларускай мовы вайсковы кіраўнік Васьнеўскі, які заявуляе: «военное дело еще не имеет белорусской терминологии». Ігнарус беларускую мову выкладчык грамадазнаўства Цюцюнкоў, які чытае лекцыі на расійскай мове. Рэдка ўжываюць беларускую мову і выкладчыкі Бялавкін і Парфяновіч, якія пераважна гавораць са студэнтамі на расійскай мове. Большасьць студэнтаў таксама гавораць на расійскай мове, асабліва студэнткі II курсу. Сярод некаторых студэнтаў маюць месца праяўленьні вялікадзяржаўнага шавінізму. Напрыклад, студэнт першага курсу Арцёменка заявляе: «не могу переносить белорусского языка». Між тым, і дырэкцыя тэхнікуму, ні грамадзкія арганізацыі не даюць адпору гэтым вылазкам вялікадзяржаўнага шавінізму. У тэхнікуме вельмі рэдка ставяцца п'есы на беларускай мове. Дырэктар тэхнікуму тлумачыць такое дрэннае становішча з беларусізацыяй тым, што няма, маў, падручнікаў на беларускай мове.

У апошні час у сьценах тэхнікуму ставілася забаронена п'еса «Сям'я пічатнікаў». Яўна ўнадніцкая, дзе праповедуецца клясавы мір паміж буржуазіяй і пралетарыятам.

У парта супраціўляецца беларусізацыі і сам дырэктар тэхнікуму, Кандрацько, які, праводзячы заняткі са студэнтамі і робячы даклады, ужывае выключна расійскую мову.

Сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, ганебна апашляюцца. Асабліва гэта выявілася на вечары, прысьвечаным пасьлядку студэнтаў другога курсу на вытворчую практыку. Тут-жа на абвясьцілі сябе ўдарнікамі і пастанавілі выклікаць на сацспаборніцтва рабочых наказальнай гаспадаркі пры тэхнікуме. Гэта вельмі добра, але-ж пазаўтра большасьць студэнтаў на заняткі не зьявілася. Характэрна, што на гэтыя ганебныя зьявішчы, якія апашляюць ідэю сацспаборніцтва і ўдарніцтва, ні адміністрацыя, ні ячэйка, ні прафком не рэагавалі, а дырэктар абмежаваўся толькі тым, што загадаў лічыць дзень прагулу выходным днём.

Сярод некаторых студэнтаў існуюць нездаровыя настроі. Напрыклад, студэнты Бажанок і Карп высунулі тэорыю «Аб разрыве пралетарыяту з працоўным сялянствам». Замест таго, каб праз грамадзкія арганізацыі, а таксама і праз студэнцкую насьценную газэту выяўляць гэтыя ўнадніцкія настроі пасобных студэнтаў, змагацца з гэтым, выхоўваць масу студэнцтва ў здаровым пралетарскім духу, бюро ячэйкі забаранила друкаваць матар'ялы аб Бажанку і Карпу ў насьценнай газэце.

Партыйнае кіраўніцтва тэхнікуму дайшло ў заціску самакрытыкі да такога ганебнага зьявішча, што кожны падрыхтаваны да выпуску чарговы нумар насьценгазэты праглядаўся сакратаром ячэйкі і толькі пасьля «візы» сакратара газэта магла ўбачыць сьвет.

Аб чым сьведчаць усе гэтыя факты? Яны сьведчаць нам аб тым, што справа выхаваньня новых кадраў у Смалянскім тэхнікуме знаходзіцца ў небясьпецы. Трэба ўзмацніць работу тэхнікуму. Трэба ўдарыць па апартуністычным кіраўніцтве і вялікадзяржаўніцкіх настроях у тэхнікуме.

СТУДЭНТ.

Падпявалы Чудзіна не атрымліваюць адпору

Бягомльскі РК КП(б)Б і РКК-РСІ у кастрычніку 1930 году распачалі праверку выканаўчага ўстанову Бягомльшчыны на беларускую мову і выкананьне ў рэйме дырэктыў партыі па ажыцьцяўленьні нацыялітыкі. На самой праверцы далі свае вынікі наогул дрэнныя адносіны ўстанову, і кіруючых органаў да праведзеньня беларусізацыі. Гэта выцякае з таго, што праверка беларусізацыі была праведзена толькі ў некаторых органах раёну, не гаворачы ўжо аб тым, што ў сельсаветах ніякая праверка не праводзілася. Вакол праверкі і мерыкіна беларусізацыі зусім ня было ніякая грамадзкая думка.

Шмат рад работнікаў, нават партыйных, пры патрэбным з боку партыйных органаў не жадаюць вывучаць беларускую мову, супраціўляюцца беларусізацыі.

Да ліку такіх адносінаў: тэхнарук Бягомскага вучлеспрамгасу — Панчанка, прараб Мсьцінскага вучгасу Бельбуду—Агрэст, рахункавод гэтага-ж гасу — Карунчык, загадчык пошты Бабсінкі, загадчык Бярэзінскай пошты Грэблянюк, упаўнаважаны райгандлю Габрышук і рад іншых.

Шмат рад установаў, як пошта, спажывчая кааперацыя, райбольніца, аптэка і іншыя, да гэтага часу не прынялі ніякіх мер, каб перавесьці сваю работу на беларускую мову.

У раёне сярод настаўнікаў ёсьць яшчэ на сёньняшні дзень такія, якія, падпяваючы Чудзіну, беларускую мову лічаць «вперыдзе». Да ліку такіх адносіцца настаўнік Карэткевіч, Ляхоўская, Жаўрыд і інш.

У раёне ня толькі дрэнна праводзіцца беларусізацыя, але амаль не вядзецца работы па іншых галінах ажыцьцяўленьня нацыянальнай палітыкі партыі. Распаўсюджваньне літаратуры на мовах нацыянальнасьцей ідзе надзвычай дрэнна. Амаль не праводзіцца масавай работы сярод працоўных нацыянальных меншасьцей. Не ажыцьцяўляецца справа аб выпуску старонкі на польскай мове ды рэгулярна «Калгасны змагар».

РК КП(б)Б абавязан прыняць усе меры для стварэньня рашучых арыўку ў выкананьні важнейшых мерапрыемстваў па нацыянальнай палітыцы партыі.

ШЫМАКОЎСКІ.

Агідны двурушнік

Працягваючы артыкул у «Зьвязьдзе» ад 16-IV «Чудзінішчыну вырваць з каранямі», студэнцкі калектыў Менскага жывёльнага тэхнікуму абуран контр-рэвалюцыйным выступленьнем былога студэнта нашага тэхнікуму — Чудзіна. Мы кваліфікуем яго выступленьне, як нахабную спробу клясавага ворага атакаваць генэральную лінію партыі ў нацыятаньні.

Яшчэ ў мінулым годзе, будучы ў тэхнікуме, Чудзін выступіў супроць вывучэньня беларускай мовы. Але, дзякуючы таму, што камсамольскі калектыў мабілізаваў вакол гэтага грамадзкую думку, ён прызнаў свае памылкі і абяцаў выправіць іх на практычнай рабоце. Паверыўшы яму, камісія на чыстцы ЛКСМ вынесла толькі суровую вымову.

Сёньняшнее выступленьне яго паказвае, што Чудзін — агідны двурушнік. Ён застаўся тым-жа разьюшаным вялікадзяржаўным шавіністам.

Чудзін сваім выступленьнем грае на руку беларускім нацыянал-дэмакратам і шавіністам усіх колераў. Ён салідарызуецца з Рэмэзінымі, Кандрацьцевымі і льле ваду на млын нацыянал-фашыстаў Заходняй Беларусі — Астроўскіх, Луцкевічаў і К°.

Усё гэта паказвае, што Чудзін ня можа быць у радах чырвонасьцяжнага пастаўніцтва, што нельга даручыць яму выхаваньне падрастаючага пакаленьня. Мы патрабуем выключэньня яго з радоў ЛКСМБ і саюзу працаўзеты.

Мы абяцаем яшчэ з большай упартасьцю разгортваць беларусізацыю і ўзмацніць інтэрнацыянальнае выхаваньне.

Абяцаем месячнік па вывучэньні нацыятаньня і ўзмацненьня беларусізацыі.

Студэнцкі калектыў
Менскага Я. П. Т.

Адкрыты ліст рэдакцыі газ. „Зьвязда"

Рабочая клясa БССР, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, з вялікім посьпехам закончыла другі год пяцігодкі, уключаючы ў рады працуючых прадпрыемстваў усё новыя і новыя фабрыкі і заводы.

У трэцім рашаючым годзе пяцігодкі павінна быць скончана пабудова Брянскага цэментнага заводу — адзінага і першага ў Беларусі. Завод павінен стаць у строй 1-га ліпеня 1931 г. і да канца году даць 1½ мільёна бочак цэменту. Вялізарнае будаўніцтва, якое разгортваецца ў БССР, патрабуе ўдвае ад свайго ўласнага беларускага цэменту, што дасьць магчымасьць хутчэй выканаць пяцігодку за чатыры гады.

Рабочыя, служачыя і інжынэрна-тэхнічны персанал пабудовы Брянскага цэментнага заводу, уліваючы вялізарнасьць задач, якія пастаўлены перад імі ў справе сваячасовага пуску заводу, арганізаваліся ва ударныя брыгады і ставяць сваёй мэтай закончыць будаўніцтва раней вызначанага тэрміну. Першых вынікаў мы ўжо дабіліся. На аснове сталінцтва і ўдарніцтва зімовыя работы на самацёчным капале закончаны на 15 дзён раней вызначанага тэрміну.

Будаўніцтва сустракаецца з вялікімі цяжкасьцямі, зьвязанымі з адсутнасьцю асноўных матар'ялаў. Нам патрэбна: каменьня і гравія 11 тыс. кубамэтраў, цэменту партландскага—2800 тон, лесу круглага—2800 кубамэтраў, лесу пілавага—2990 кубамэтраў, жалеза гатунковага—600 тон, шыны пятнаццацай 824 тоны, алебастру—425 тон, балак таўравых—220 тон, і цьвікоў—35 тон. У першым квартале мы павінны былі атрымаць большую частку вышэй пералічаных матар'ялаў. Гэтых матар'ялаў будаўніцтва поўнасьцю не атрымала. Вінаватымі гэтага выяўляюцца: Беллесбыт, якія павінен забясьпечыць лесматар'ялам, Саюзстройзабесьпячэньне у Маскве і кантора «Сталь у Менску, якія павінны былі забясьпечыць будаўніцтва цэментам, жалезам, таўравымі балкамі і г. д. Мэтызаўпраўленьне, якое павінна забясьпечыць цьвікамі і Будаўбяднаньне ВСНГ БССР — вапнай, каменем, цэглай і гаручым для механізмаў.

Несвячасовае забясьпячэньне пералічанымі матар'ялямі ставіць пад пагрозу сканчэньне будаўніцтва ў тэрмін.

З боку Будмашыны патрабуецца тры зьвены рухомых печак, з якіх адно, з прычын бюракратычных адносін да справы, заслана ў Баку, а рад абсталяваньняў (вэнтылятары высокага даўленьня, два кампрэсары, два вугальных млыны, паветравы эканомайзэр, два электраматоры, вальцавая драбілка і шляповыя помпы яшчэ нават не заказаны.

Мы зварачаемся да ўраду і ўсёй грамадзкасьці ўзьдзейнічаць па вышэй пералічаным установы, даўшы нам магчымасьць закончыць пабудову заводу да тэрміну. Адначасова просім Рабоча-сялянскую інспэкцыю ўмяшацца ў гэту справу і выкрыць вінаватых у дрэнным забясьпячэньні будаўніцтва патрэбнымі матар'ялямі.

Са свайго боку мы—рабочыя, служачыя, і інжынэрна-тэхнічны склад у ліку 850 чал., абяцаем на аснове шырока разгорнутага спаборніцтва і ўдарніцтва і бязьлітаснай барацьбы з малаверамі і шыцікамі, зьнішчаючы ўсякія перашкоды, скончыць пабудову беларускага гіганту—цэментнага заводу да ўстаноўленага тэрміну.

Па даручэньні агульнага сходу:

Сакратар партыйнай ячэйкі
ГЛАДКОЎ.

Старшыня рабочага камітэту
ІВАНЬКОЎ.

Упаўнаважаны будканторы
БЭРМАН.

Тэхнічны кіраўнік будканторай
ЯКУШКА.

Рабочыя-ўдарнікі: машыніст
ЗАЙЦАЎ, бэтоншчык КАНАВАЛАЎ.

Напярэдадні ўсебеларускага зьезду рацыяналізатараў

Рацыяналізацыя—асноўны вагар выкананьня прамфінпляну

Недаацэнка ролі сацыялістычнай рацыяналізацыі і ўдзелу ў ёй шырокіх рабочых мас—горшы від правага апартунізму на практыцы

Мабілізаваць актыўнасьць перадавых рабочых на датэрміновае выкананьне і перавыкананьне рацыяналізатарскіх плянаў, на збор новых тысяч рабочых прапаноў!

Будаўніцтва—на індустрыяльныя мэтады

XVI зьезд УсеКП(б) вызначыў вялізарны зрух у галіне рэканструкцыі будаўніцтва. Вось пастанова зьезду: «Усё больш паляпшаныя разьмеры і паскарэньне тэмпаў капітальнага будаўніцтва патрабуюць рашучага фарсаваньня пераходу на індустрыяльныя мэтады будаўніцтва шляхам стандартызацыі, тыпізацыі і сваячасовага праектаваньня, а таксама максымальнай мэханізацыі будаўнічых работ і стварэньня пастаянных кадраў будаўнікоў». Дана цэлая праграма работ, але трэба сказаць, што за выкананьне гэтай важнейшай дырэктывы мы сур'ёзна яшчэ не ўзяліся.

Будаўнічы двор, які маркуецца пабудаваць у Менску, яшчэ толькі праектуецца. Амаль нічога ня зроблена ў галіне ўкараненьня новых будаўнічых матар'ялаў, за выключэньнем насыпкі людзей у Маскву для падрыхтоўкі майстроў па новых будматар'ялах.

На тэрыторыі БССР зноўдзены залежы трэпела, але да гэтага часу невядома ці зроблен аналіз яго, а ў справе распрацоўкі залежаў ніхто нічо не зрабіў. Між тым, ужываньне трэпела значна зьмякчыць дэфіцыт цэменту і дасьць магчымасьць рабіць больш тонкія сьцены, што прывядзе да зьніжэньня сабекошту будаўніцтва.

Мала зроблена ў справе ўлываньня цёплых растворaў (калі замест пяску ў раствор даюць шлак), што таксама павінна даць магчымасьць рабіць больш тонкія сьцены са звычайнай цэглы.

У бягучым годзе Будаб'яднаньне павінна даць ня менш 30 млн. штук эфэктыўнай цэглы. Аднак гэта работа яшчэ ня вынца з лябараторных сьцен.

Плянам рацыяналізацыі па будаб'яднаньні вызначана эканомія ў 1931 г. 1.900 тыс. рублёў. Выкананьне і перавыкананьне гэтай лічбы залежыць ад таго, як сурёзна будзе пастаўлена работа рацыяналізатарскіх органаў і наколькі будуць уцягнуты ў гэту справу шырокія масы рабочых. Пакуль што рабочае вынаходзтва на пабудовах не арганізавана. Органы садзейнасьці рабочаму вынаходзтву ня створаны. Вось, напрыклад, барысаўская кантора Будаб'яднаньня паведамляе, што за 1930 год паступіла ўсяго **адна рабочая прапанова**. Такі-ж малюнак і ў іншых мясцох. Ніякага ўліку рабочых прапаноў няма. Ці-ж гэта не сапраўды махровы правы апартунізм?

Усё гэта гаворыць за тое, што мы пакуль зрабіць рашучы пералом у будаўніцтве і ў першую чаргу дабіцца таго, каб вакол будаўніцтва, вакол рацыяналізацыі будаўніцтва сканцэнтраваць увагу партыйных арганізацый і рабочых мас.

Першы ўсебеларускі зьезд рацыяналізатараў павінен стаць пераломным момантам у галіне рацыяналізацыі наогул і ў будаўніцтве ў прыватнасьці.

ПАШКЕВІЧ.

Бюракраты з заводу „Пралетары"

Рабочы Сальнікаў у часе яго працы ў Гомельскім працалектыве мэталістаў вынайшоў прэс для выпрацоўкі сетак для ложкаў. З прычыны ліквідацыі ўказанага працалектыву, гэты варштат знаходзіцца ў Гомельскім ліквідкоме кіраўніцтва працалектыву, якому Наркамфінпрацы прапанаваў знайсьці пакупцоў на гэты прэс і з сумы, якую яны атрымаюць, прэміяваць тав. Сальнікава. Гэта ўстаноўка зьяўляецца нэраціянальнай, наколькі прэміяваньне рабочага павінна грунтавацца выходзячы з галовай эканоміі ад вынаходзтва, а не ад каштоўнасьці яго. Таму ВСНГ, зацікаўўшыся гэтай справай, прапанаваў Белмэталяаб'яднаньню даручыць інжынэру гомельскага заводу «Пралетары» азнаёміцца з гэтым прэсам і вывіць магчымасьці скарыстаньня яго на адным з заводаў металяабяднаньня.

Белмэталяаб'яднаньне 16 студзеня дало загад заводу «Пралетары» азнаёміцца з гэтай справай. Пасьля шматлікіх напамінкаў быў атрыман адказ, які сьведчыць аб тым, што **на заводзе «Пралетары» ёсьць яшчэ бюракраты.** Вось гэты адказ: «Паведамляю, што мною быў пасланы загадчык тэхаддзелу тав. Валашоў для вызначэньня прыгоднасьці прэса — вынаходства тав. Сальнікава. Аказалася, што прэс ня меў некаторых деталей і апрача таго ня было магчымасьці дэтальна агляднуць прэс, бо ён знаходзіцца **нінутым уверх ніжнай плітаю**, а таму ўсё закрыта. Таму ня было ніякай магчымасьці вызначыць яго прыгоднасьць». Камэнтары лішнія.

КРАН.

З 21 прапановы выканана 7

На Мазырскай фабрыцы «Чырвоны Кастрычнік» вытворчы сэктар фабкому атрымаў 48 рабочых прапаноў. З іх 21 была прынята для выкананьня. Аднак выкананa толькі 7. Прычына ў тым, што адміністрацыя зусім ня цікавіцца рабочымі прапановамі, хоць яны павінны даць 6 тысяч руб. эканоміі ў год.

Рацыяналізатарская работа на фабрыцы не разгорнута. Рацыяналізатар-вынаходнік ніякай дапамогі ад інжынэрна-тэхнічнага персаналу не атрымлівае.

Брыгадзір «Зьвязды»
АРГОЛІН.

Задачы зьезду рацыяналізацыі —у масы

Да гэтага часу многія нашы работнікі не ўсьвядомілі, што рацыяналізацыя гэта масавая работа і без прыцягненьня шырокіх рабочых мас яна ня можа даць адпаведнага эфэкту. Характэрна, як менскія прадпрыемствы рыхтаваліся да першага ўсебеларускага зьезду рацыяналізатараў, які, як вядома, павінен быў адбыцца 29 сакавіка. Праверка на менскай шэйнай фабрыцы «Кастрычнік» выявіла, што паведамленьне аб скліканьні першага ўсебеларускага зьезду рацыяналізатараў было прынята да ведама толькі аддзелам рацыяналізацыі фабрыкі і далейшага праламленьня не атрымала. Нават у парткалектыве і фабкоме ня ведалі аб надыходзячым зьезьдзе. Зразумела, што і рабочая грамадзкасьць зусім ня была інфармавана аб зьезьдзе, фабрычная газэта маўчала. Аддзел рацыяналізацыі рыхтуе да зьезду выстаўку браку і дасягненьняў, але эпоў такі гэта работа праводзіцца выключна сіламі работнікаў аддзелу.

Фабрыцы «Кастрычнік» у ліку іншых далёкіх месц прадстаўлена адно месца для рабочага вынаходцы-ўдарніка. Ясна, што гэта кандыдатура павінна быць выдучана не ў адміністрацыйным парадку, а шляхам абгаварэньня на сходзе вынаходцаў-ударнікаў фабрыкі, якія павінны вылучыць гэту кандыдатуру і потым патрабаваць ад гэтага таварыша інфармацыі аб работе зьезду. Апрача далёкіх месц, прадпрыемствам, у ты ліку і фабрыцы «Кастрычнік» прадстаўлены і месцы для гасьцей. Гэта тым больш патрабуе шырокага і падрабязнага азнаямленьня рабочых са значэньнем і задачамі зьезду рацыяналізатараў.

Ня лепш падрыхтаваліся да зьезду на заводзе імя Варашылава. Праверка была зроблена 26 сакавіка і выявілася, што да 25 сакавіка аб зьезьдзе ведаў толькі загадчык аддзелу рацыяналізацыі. Паліграфаб'яднаньне толькі 24 сакавіка напісала сваім прадпрыемствам аб неабходнасьці падрыхтоўкі да зьезду і прапанавала зрабіць дыяграмы і экспанаты для выстаўкі.

Такім чынам выявілася, што падрыхтоўка да зьезду была праведзена зусім невыстарчальная. Зьезд адкладзен на 20 **красавіка**. Старую памылку трэба ўлічыць. Час, які застаўся да зьезду, трэба скарыстаць для шырокай папулярызацыі задач зьезду на рабочых сходах, у насьценгазэтах і шматтыражках.

ВОЛЬКНШТЭЙН.

Арганізаваць экспэрымэнтальныя майстэрні

Паводле пастановы ЦК УсеКП(б) ад 26 кастрычніка 1930 году на кожным прадпрыемстве павінны быць створаны **экспэрымэнтальныя брыгады** для выкананьня рабочых прапаноў. Для гэтай мэты могуць быць скарыстаны школы ФЗВ, тэхнічныя кансультацыі і г. д.

ВСНГБ меркаваў набудаваць у Менску спэцыяльныя майстэрні, якія-б маглі ажыцьцяўляць больш-менш складныя вынаходзтвы і прапановы рабочых. Справа гэта была даручана камісіі і на гэтым скончылася.

Што ў нас ёсьць на заводах? Зразумела, спэцыяльных **майстэрань** няма. Таксама рэдка можна знайсьці спэцыяльныя брыгады для выкананьня рабочых прапаноў. Звычайна **гэту** работу даручаюць мэханіку заводу, ня лічачыся з тым, ці ёсьць магчымасьць у кароткі тэрмін выканаць рабочую прапанову. Адсюль значная затрыжка з выкананьнем рабочых прапаноў, шмат выпадкаў прапажы чарцяжоў і г. д.

Мы маем шмат каштоўных вынаходзтваў, якія ня можам ажыцьцявіць пры сучасным становішчы з экспэрымэнтальнымі брыгадамі. Заводы, якія маюць магчымасьць выконваць заказы іншых прадпрыемстваў паводле чарцяжоў вынаходцаў, катэгарычна адмаўляюцца, кажучы: «У нас ёсьць прамфінпляны, мы дробязямі не займаемся».

Даўно час пакончыць з такімі адносінамі да выкананьня рабочых прапаноў і вынаходзтваў. Што трэба зрабіць?

1. Прапанаваць усім аб'яднаньням, заводакіраўніцтвам праверыць, што зроблена для практычнага ажыцьцяўленьня рабочых прапаноў і вынаходзтваў.

2. На ўсіх заводах павінны быць створаны экспэрымэнтальныя брыгады ці майстэрні, якія павінны ўжыць усе магчымасьці для выкананьня рабочых прапаноў.

3. Арганізаваць завод або спэцыяльныя майстэрні пры ВСНГБ. Гэты завод павінен паставіць сабе мэтай прапрацоўку складаных праектаў вынаходзтва, разгляд складаных рабочых прапаноў, прыцягваючы да гэтага аўтарытэтныя камісіі з навуковых работнікаў адпаведных спэцыяльнасьцей.

РАЦЫЯНАЛІЗАТАР.

Слова за пракуратурай

«Віцебскі Пралетары» ўжо раз адзначаў пакуты вынаходцы Нясхіззава—работніка Віцебскага ЦРК, які вынайшоў рад рэчаў у справе рацыяналізацыі абслугоўваньня пакупцоў. Тав. Нясхізаў не атрымаў належнай дапамогі з боку кіраўніцтва ЦРК, а таксама партыйнай і прафсаюзнай арганізацыі. Яго ігнаравалі, не давалі грошай на выраб мадэляй і г. д.

Калі гэтым пытаньнем зацікавілася гарпраўленьне саюзу саўтаўдальслужачых, азнаведныя асобы атрымалі спагнаньні. Некалькі дзён тав. Нясхізаў сустракаў зацікаўленасьць да яго прапаноў. Але гэта было толькі пасьля атрыманьня вымоў. Праз некалькі дзён аб ім зноў забылі. Вось ужо паўтары месяцы прайшло, а вынаходзтвы Нясхізава не рэалізуюцца.

Больш таго. Тав. Нясхізаў зараз вынайшоў хлебарэзку, якую ўхвалілі многія інстанцыі і нарады, але зноў нічога ня робіцца для рэалізацыі гэта вынаходзтва.

Адначасова трэба адзначыць, што Віцебская кантрольная камісія, якой фракцыя саюзу саўтаўдальслужачых перадала матар'ял аб трыкутніку ЦРК, больш месяца пытаньня не разглядае.

Трэба пакласьці канец такому ганебнаму факту. Слова за пракуратурай і партыйнымі органамі.

І. Б.

Дырэктывы дыбам

Інжынэр Глускін на заводзе імя Варашылава за два гады сваёй работы зьмяняў пасады чатыры разы. Апошні раз ён быў перакінут у аддзел рацыяналізацыі. Справа добрая. Інжынэры ў аддзеле рацыяналізацыі патрэбны. Але не прайшло і двух тыдняў, як была атрымана адносіна з Белмэталяаб'яднаньня—адкамандыраваць інжынэра Глускіна ў распараджэньне аб'яднаньня.

Рацыяналізатары заводу абуралы. Яны кажуць, што пастанова СНК СССР аб тым, каб не забіраць спэцыялістаў ад прадпрыемстваў, здаецца, датычыць і Белмэталяаб'яднаньня. Накопт узмацненьня органаў рацыяналізацыі ёсьць таксама шмат дырэктыў. Аднак, Белмэталяаб'яднаньне не даацэньвае ролі рацыяналізацыі і, замест узмацненьня заводаў работнікамі, забірае іх для свайго апарату.

Гэтай справай павінна зацікавіцца РСІ.

ІВАНОЎ.

АБЯЗЬЛІЧКУ ЛІКВІДАВАЦЬ ВА УСІХ ЗЬВЕНЬНЯХ ТРАНСПАРТУ

Вопыт дэпо Ліскі паказаў рэзкае паляпшэньне работы паравознага парку. Перанесьці гэты вопыт на ўсе чыгуначныя вучасткі БССР

Шырока абгаварыць вопыт ст. Ліскі

Ажыцьцяўленьне гістарычнай адозвы ЦК і СНК забясьпечыла з першыхжа дзён паляпшэньня важнейшага зьвяна транспарту—паравозный гаспадаркі. Ліквідацыя абязьлічкі і ўвядзеньне спаранай язды зьявіліся пачаткам аздараўленьня паравознага парку.

Як адзначыў народны камісар шляхоў зносін СССР тав. РУХІМОВІЧ, «гэтыя посьпехі ў значнай меры зьяўляюцца вынікам актыўнага ўдзелу паравозных брыгад у правядзеньні і замацаваньні спаранай язды пры наяўнасьці паступовага росту спаборніцтва і ўдарніцтва».

Аднак, ажыцьцявіць у поўнай ступені спаранную, атрымаць ад яе поўны эфэкт нельга толькі работай адных паравозных брыгад, без сваячасовага і добраякаснага рамонту, без устанаўленьня цьвёрдай адказнасьці ў рабоце апарату, які суправаджае цягніні.

Побач з фактамі сапраўдкай барацьбы за замацаваньне спаранай, за здаровы паравоз наглядаюцца выпадкі бюракратычных адносін да гэтай справы, выпадкі простага зрыву спаранай і дрэннай работы дэпо (Магілеў, Віцебск).

Трэба з усёй цьвёрдасьцю падкрэсьліць, што адміністрацыя і партыйна прафэсыянальныя арганізацыі гэтых вузлоў не вялі работы па замацаваньні спаранай, па барацьбе за добраякасны рамонт, за сваячасовы выпуск паравозаў з рамонту і г. д. Па радзе вузлоў спаба наладжана масавая работа і кіраўніцтва сацыялістычным спаборніцтвам.

ПОЎНАЕ АЗДАРАЎЛЕНЬНЕ ПАРАВОЗНАЯ ГАСПАДАРКІ НЕМАГЧЫМА БЕЗ ПАСТАНОЎКІ НА АДПАВЕДНУЮ ВЫШЭЙШУЮ ЯКАСЬЦІ РАМОНТУ, УСТАНАЎЛЕНЬНЯ АДКАЗНАСЬЦІ РАМОНТНЫХ БРЫГАД ЗА ЯКАСЬЦЬ І ТЭРМІН РАМОНТУ, БЕЗ ЛІКВІДАЦЫІ АБЯЗЬЛІЧКІ Ў АБСЛУГОЎВАНЬНІ ЦЯГНІКОЎ.

У даным выпазку набывае асабліва важнае значэньне вопыт дэпо ст. ЛІСКІ і ст. МАСКВА—1 КУРСКАЙ,—якія зьмянілі старую сыстэму рамонту—ліквідавалі абязьлічаны рамонт, устанавіўшы цьвёрдую адказнасьць рамонтных брыгад за сваячасовы і добраякасны рамонт, ліквідавалі абязьлічку і ў абслугоўваньні цягнікоў апаратам руху.

Вось як перадае вопыт станцыі Ліскі брыгада УсеЦСПС і выязной рэдакцыі «Труда»:

«Зараз можна сьмела сказаць, што паравозны парк Ліскінскага дэпо ў асноўным аздароўлен, паравозны парк выконвае ўскладзеныя на яго вытворчыя задачы. Як зараз пастаўлена работа? У дэпо складзены тры вытворчыя групы. Кожная група разьбіваецца на зьмены. Кожная група пачынае рамонт паравоза і яго заканчвае. Гэты-ж паравоз пры наступным рамонце ідзе да тэй-жа самай групы. Пастаянная работа ў адной групе дае магчымасьць «трыкутніку» групы правільна расставіць сілы па зьменах. Кіраўнік групы адказвае за якасьць работы усёй зьмены і сочыць за яе работай. Пры такой сыстэме нельга захаваць дрэнную работу, нельга заліць дрэнную работу на папярэднюю зьмену. «Трыкутнік» зьбуёды можа нападзіць сапраўдную праверку. Працяжная супольная работа ў адной зьмене выразна выявіць, хто ўдарнік і хто толькі прыкрываецца званьнем ударніка. Гэта сыстэматычнае вывучэньне работы кожнага сьлесара дае магчымасьць пры адначасовым увядзеньні бальнай сыстэмы вучоту лёгка і быстра улічаць вынікі сацыялістычнага спаборніцтва».

У выніку праведзенага вопыту, дэпо ст. Ліскі ня мае ніводнага выпадку адказу ў выдачы паравоза, у той час, калі яшчэ ў сакавіку за адну дэкаду было недадана 26 паравозаў.

Ліскінскія чыгуначнікі высунулі і задачу ўзмацненьня барацьбы за ўпарадкаваньне руху, за паляпшэньне работы аддзелу экспляатацыі і шляху. Для гэтага яны прапануюць замацаваць за цягнікамі пастаянныя мацныя «трыкутнікі». Гэтыя «трыкутнікі» дапамогуць вывіць і павесьці канкрэтную барацьбу з элемэнтамі, якія зрываюць выкананьне трансфікпляну. Яны-ж сочаць за сваячасовым давядзеньнем цягніка да вызначанай станцыі і без «здарэньняў». У вузлавых пунктах чыгуначнікі прапануюць арганізаваць «галаўныя трыкутнікі», якія штодзённа разглядаюць рапарты цягніковых «трыкутнікаў» і прымаюць па іх тэрміновыя меры. Для абагуленьня работы цягніковых «трыкутнікаў» і хутчэйшага выяўленьня слабых вучасткаў руху скліканцца сходы гэтых «трыкутнікаў». Да большасьці цягнікоў прымацоўваюцца пастаянныя кандуктарскія брыгады.

Вопыт ст. Ліскі падхоплен радам чыгуначных вузлоў. Партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі чыгунак БССР павінны шырока разгарнуць абгаварэньне вопыту ст. ЛІСКІ, паставіўшы сабе задачай ліквідаваць абязьлічку ва ўсіх вучастках транспарту, пачынаючы ад паравоза і канчаючы змазкай іх. У гэтым зараз аснова ажыцьцяўленьня адозвы ЦК і СНК.

Да пропуску веснавых вод не гатовы

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Начальнік дыстанцыі шляху Даронін ня прыняў пілякіх мер да пропуску веснавых вод і нарыхтоўкі матар'ялу для рамонту шляхоў. У выніку ўжо зараз зьменшана хуткасьць манэўровых цягнікоў да 5 клм. у гадзіну, замест плянавых 15 клм.

***

Па віне прараба Марчэнка два вагоны цэменту прыведзены ў непрыгоднасьць.

Лінейныя суды ня справіліся з работай

Партыйна-прафэсыянальныя арганізацыі не аддавалі належнай увагі лінейным судом. Вакол работы судоў ня была мабілізавана грамадзкая думка

(Гутарка з членам транспартнага бюро ЦК КП(б)Б тав. Судаковым

Лінейныя суды ў справе барацьбы з недысцыплінаванасьцю, безгаспадарчасьцю, бездаждзянымі адносінамі да працы, са шкодніцтвам на транспарце прызваны адыграць вялікую ролю. Аднак, з гэтымі задачамі лінейныя суды БССР ня справіліся. Гэта канстатаваў Сакратарыят ЦК КП(б)Б, які гэтым днём заслухаў даклад аб іх рабоце.

Лінейная пракуратура і суды не ўсьвядомілі тых задач, якія перад імі стаяць у даны перыяд.

Рад разгледжаных спраў, якія маюць важнае палітычнае значэньне, лінейныя суды змазалі. Вакол работы лінейных судоў ня была арганізавана грамадзкая думка. Партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі транспарту мала цікавіліся работай лінейных судоў.

Рад дробных спраў, якія падсудны парсуцом, разглядаліся лінейнымі, а ў той-жа час важныя палітычныя справы заставаліся нерозгледжанымі. Няправільна выяўлялася мера пакаранньня.

Друк зусім мала зварачаў увагі на лінейныя суды, не асьвятляў іх работы, не арганізоўваў грамадзкай думкі вакол апошніх. Лінейная пракуратура вельмі марудна праводзіць сьледзтва па справах шкодніцкаў. У Жлобіне быў выпадак, калі пракуратура не прыцягнула да адказнасьці сапраўднага шкодніка, а ўзьняла судовую справу супроць «стрэлачнікаў». Пракуратура таксама зусім не наглядае за дысцыплінарнымі спагнаньнямі з боку транспартнай адміністрацыі.

Адміністрацыя ў радзе выпадкаў не ўявіла сабе функцыі лінейных судоў і перадае на разгляд ім справы, якія павінны вырашацца ў дысцыплінарным парадку, а з другога боку справы, якія падлягаюць разгляду лінейных судоў, разглядаюцца ў дысцыплінарным парадку.

Сакратарыят ЦК даручыў Наркамюсту прыняць усе захады для выпраўленьня недахопаў у рабоце лінейных судоў і абавязаў усе партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі на транспарце дапамагчы лінейным судом у іх рабоце, у прыватнасьці правесьці перавыборы народных засядацеляў, якія павінны складацца з лепшых ударнікаў-актывістаў.

„Тэмпы" тав. Хавіча

Тэмпы рашаюць. Кожны дзень, кожная гадзіна высоўвае рад баявых, ударных задач. Тое, што трэба зрабіць сёньня, нельга адкладаць на заўтра, інакш мы адстанем, інакш губляецца каштоўнасьць і сваячасовасьць таго ці іншага мерапрыемства. Аб гэтым павінен ведаць кожны работнік, які ня хоча плясьціся ў хвасьце. Аднак, як відаць, гэтага не ўсьвядомілі асобныя работнікі Белсадгародніны.

26-га сакавіка, за подпісам нам. дырэктара Белсадгародніны тав. Хавіча, рэдакцыя «Зьвязды» атрымала адносіну, у якой паведамлялася:

«28-га верасьня мінулага году Клімавіцкім гарпо загружана бульбы ў вагон № 789729 16,4 тон, у той час, калі пад'ёмная вага вагону—50 тон. У такім выглядзе вагон адпраўлен у Ленінград па дублікаце № 94598. З прычыны гэтага зроблена перапла та тарыфу па 223 рублі 84 кап., што выклікала падаражэньне кошту бульбы і няправільнае карыстаньне транспартам».

Як бачыце, у Белсадгародніны тэмпы «надзвычай высокія». Тое, што было ў верасьні мінулагагоду году, тав. Хавіч успоміў толькі ў сакавіку 1931 г. Зусім відавочна, што прыведзены факт няправільнага скарыстаньня транспарту зьяўляецца злачынным але сваячасовае выкрыцьцё гэтага факту праз друк прынесла-б значна больш карысьці, чым фіксацыя яго праз паўгода. Калі такімі

У бой за кожнае кілё ільну

У АДКАЗ НА АДОЗВУ РАБОЧЫХ „ДЗЬВІНЫ“

Белкалгасцэнтр заклікае ўсе калгасы перавыканаць пляны ільназагатовак, забясьпечыць тэкстыльную прамысловасьць сырцом і паказаць прыклад аднаасобнікам

Даючы бязьлітасны адпор кулацтву, цесна злучаючы загатоўкі ільну з калгасным прылівам, ажыцьцяўленьнем плянаў бальшавіцкай вясны, кантрактацыяй тэхнічных культур, калгасьнікі павінны дабіцца перамогі ў барацьбе за бальшавіцкія тэмпы.

Выканаем свой абавязак перад пралетарскай дзяржавай

Усім калгассаюзам і праўленьням калгасаў

Шырокія бядняцка-сераднякцкія масы вёскі, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі і пры вялізарнейшай вытворчай дапамозе з боку пралетарскай дзяржавы, пасьпяхова перабудоўваюць свае дробныя адзнаасобныя гаспадаркі ў буйныя калектыўныя і практычна ажыцьцяўляюць ліквідацыю кулацтва як клясы, разгортваючы суцэльную калектывізацыю.

Савецкая ўлада робіць усё магчымае для таго, каб як мага хутчэй узьняць на самы высокі ўзровень вытворчасьць калгасаў і дабрабыт калгасьнікаў. Ужо ў бягучым годзе ў БССР будуюцца 30 МТС, 46 новых заводаў па пераапрацоўцы ільну і канапель, калгасам і калгаснікам дадзены вялізарныя ільготы па с.-г. падатку і г. д.

Задача ўсіх калгассаюзаў, калгасаў, калгасьнікаў і калгасьніц па-бальшавіцку выкарыстаць усе магчымасьці для дасягненьня ў найбольш кароткі тэрмін высокага выхаду таварнай прадукцыі ў калектыўных гаспадарках, каб забясьпечыць бесперабойную работу і далейшае разгортваньне нашай сацыялістычнай прамысловасьці.

УСЕ КАЛГАСЫ ПАВІННЫ СВАЯЧАСОВА І ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАЦЬ СВАЕ АБАВЯЗКІ ПЕРАД ПРАЛЕТАРСКАЙ ДЗЯРЖАВАЙ.

Праўленьне Калгасцэнтру БССР канстатуе, аднак, што паасобныя калгасы, пад уплывам кулацкай агітацыі і ў выніку дрэннай арганізацыі працы і разьгільдзяйства несваячасова апрацавалі лён і ня выканалі пляну ільназагатовак. На 10-IV-31 г. плян загатовак ільнавалакна выканан калгасамі толькі на 42,6 проц. Калгасы ня выканалі сваіх абавязкаў перад пралетарскай дзяржавай і парушылі бесьперабойную работу прамысловасьці.

Ня ўсё яшчэ зроблена для таго, каб ажыцьцявіць план засеву тэхнічных культур у бягучым годзе,—ня скончана кантрактацыя.

У мэтах ліквідацыі прарываў у ільназагатоўках і сапраўды бальшавіцкай падрыхтоўкі да веснавой сяўбы, Калгасцэнтр БССР, у АДКАЗ НА АДОЗВУ РАБОЧЫХ ІЛЬНА-ПРАДЗІЛЬНАЙ ФАБРЫКІ «ДЗЬВІНА» І АРШАНСКАГА ІЛЬНАКАМБІНАТУ ПРАПАНУЕ ЎСІМ КАЛГАССАЮЗАМ І ПРАЎЛЕНЬНЯМ КАЛГАСАЎ БЕЗАДКЛАДНА МАБІЛІЗАВАЦЬ ЎСЕ СІЛЫ КАЛГАСЬНІКАЎ НА ПОЎНАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНУ ЗДАЧЫ ІЛЬНАВАЛАКНА, СКОНЧЫЦЬ КАНТРАКТАЦЫЮ ТЭХКУЛЬТУР У КАЛГАСАХ ДА 1-ГА МАЯ 1931 ГОДУ, ПОЎНАСЬЦЮ ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ КАМПАНІЮ ПАТРЭБНАЙ КОЛЬКАСЬЦЮ НАСЕНЬНЯ З ТЫМ, КАБ ПЕРАВЫСІЦЬ ПЛЯНЫ ЗАСЕВУ ТЭХКУЛЬТУР.

Шырока папулярызуючы адозву рабочых ільнапрадзільнай фабрыкі «Дзьвіна» і Аршанскага ільнакамбінату, трэба дабіцца арганізацыі новых калгасаў і шырэйшае разгарнуць уцягненьне бядняцка-сераднякіх гаспадарак у існуючыя калгасы.

Таварышы калгасьнікі! фабрыкі чакаюць ільну! Наш абавязак, даючы рашучы адпор кулацтву, вязучы з ім бязьлітасную барацьбу, безадкладна скончыць плян ільназагатовак і забясьпечыць выкананьне і перавыкананьне пляну засеву тэхкультур у бягучым годзе.

Старшыня Калгасцэнтру БССР МІЦЬКОЎ

Парыцкія арганізацыі забыліся аб сваіх абавязках перад прамысловымі цэнтрамі

ПАРЫЧЫ. (Наш кар.).

Парыцкія раённыя арганізацыі пакідаюць усю загатоўленую бульбу ў сьвінаадкормачных пунктах, цэрабкопы і на мясцовыя заводы. Аб адгрузцы ў прамысловыя цэнтры райарганізацыі нават і ня думаюць. На сёньняшні дзень ня вывезен ні адзін вагон.

Лён ёсьць! Яго трэба сабраць

СЛУЦАК. (Наш кар.). Лён зьяўляецца адным з асноўных відаў сырцу для тэкстыльнай прамысловасьці, загатоўкі яго маюць надзвычай важнае гаспадарчае значэньне. Гэтага ня ўлічылі арганізацыі Слуцкага раёну. Плян загатовак ільнавалакна па раёне выканан толькі на 40 проц., а плян загатовак ільнасемя — на 72 проц.

Шырокія масы калгасьнікаў беднякоў і сераднякоў, актыў вёскі не мабілізаваны на барацьбу за лён. Партыйна-камсамольскія арганізацыі вёскі ня сталі на чале штурму прарываў у ільназагатоўках. У Мялешкаўскім сельсавеце недабкладзены кулацка-заможныя гаспадаркі.

Трэба неадкладна мабілізаваць усю грамадзкасьць, каб выканаць плян загатовак. Лён ёсьць. Яго трэба сабраць.

Я. Жыпка.

Дзе націск на кулака

Магілеўскі раён—вам слова!

Удзельная вага Магілеўскага раёну ў ільназагатоўках даволі вялікая — ён павінен здаць 462 тоны. Тым большая адказнасьць падае на раённыя загатоўчыя арганізацыі, якія панёсшы былі разгарнуць баявыя тэмпы барацьбы за лён. Аднак, загатоўкі ў Магілеўскім раёне застылі на пункце замараньня. На 10 красавіка загатоўлена толькі 33 проц. пляну па ільнавалакне, 57,7 проц. па ільнасемі і 4,6 проц. — па ільнацы.

Цьвёрдыя заданьні кулацка-заможным гаспадаркам яўна зьменшаны: яны даны 3,5 проц. гаспадарак на 5,6 проц. пляну. Спагнана толькі 35,7 проц. Такім чынам, мы маем тут **недабкладаньне клясава-варожых элемэнтаў, невыяўленьне кулакоў і аслабленьне спагнаньня цьвёрдых заданьняў.** Такі-ж малюнак па зборы ільнасемя: цьвёрдыя заданьні атрымалі 2,8 проц. гаспадарак на 3 проц. пляну. Спагнана 31,6 проц.

Ніякіх даных аб загатоўках ільнацы і канапель няма.

Сакратар райкому тав. **Малашонак** і старшыня РВК тав. **Жалезны** павінны адказаць, чым тлумачыцца такі прарыў у ільназагатоўках, чаму дапушчана аслабленьне націску на кулацкія элемэнты вёскі.

18-га красавіка, у 6 з палов. гадзін вечара, у клюбе Дзяржпляну (Пляц Волі, № 5) адбудзецца даклад камісіі ЦКК-РСІ па чыстцы Дзяржпляну на тэму:

„Як шкоднікі і апартуністы рыхтавалі зрыў Індустрыялізацыі БССР“.

На гэты даклад паведзен зьявіцца ўвесь кіруючы, інжынэрна-тэхнічны, апэрацыйна-плянавы апарат прамысловых аб'яднаньняў і прадпрыемстваў.

Запрашаюцца ўдарнікі, рацыяналізатары і вынаходцы прадпрыемстваў.

ЦКК-РСІ.
Менгарком КП(б)Б.

Новая гасьцініца

На рагу Савецкай і Камсамольскай вул. знаходзіцца 6. гасьцініца «Гарні». Прэзыдыум Менгарсавету пастанавіў памяшканьне скарыстаць пад гасьцініцу. Інтэрнат будзе пераселены у іншае памяшканьне.

НА р. ПРЫПЯЦІ ПАЧАЎСЯ ЛЕДАХОД

вадой зьнесена частка лесаматар'ялаў у раёне Пхову

Здарэньне на Пхове—перасьцярога ўсім сплаўным арганізацыям

Неадкладна ўмацаваць лесаматар'ялы на берагох рэк.—Не дапусьціць уносу лесу вадой.—Быць падрыхтаванымі да паводкі

Улічыць урокі Пхова

На р. Прыпяці ў раёне Пхова пачаўся ледаход нязвычайнай сілы. Частка лесу, які ў мінулым годзе быў прыкладаўлен на берагу і прымацаваны канатамі да дубовых дрэваў, зьнесена ледаходам. Дрэвы былі вырваны з карэньнямі. Прынятыя меры для далейшага ўмацаваньня лесу. Мабілізавана насельніцтва, другія суткі дзяжураць санёрныя ўзрыўныя каманды.

Здарэньне на Пхове павінна быць сыгналам для ўсіх леспрамгасаў і лесазаводаў, якія нядбайна адносяцца да замацаваньня лесу і ігнаравалі адпаведныя дырэктывы.

Зараз-жа трэба на ўсіх рэках умацаваць лес, сачыць за тым, каб ён ня быў зьнесен вадою, зрываць і калоць лён, дзе гэта патрэбна. Нельга дапусьціць, каб хоць адно бервяно было зьнесена вадою.

СУКАЛА.

16 тысяч кбм. лесу—пад пагрозай паводкі

ПОЛАЦАК. (Наш кар.). Амаль усе румы полацкага леспрамгасу знаходзяцца ў нізінах і ім пагражае паводка. У часе падвозкі бярвенняў дарок, зусім ня была ўлічана гэта пагроза.

Вось, напрыклад, на [illegible] Нікулава, Махіраўскага сельсавету, знаходзіцца 2.000 кубамэтраў лесаматар'ялаў, якія ў часе разводзьдзя могуць быць зьнесены вадой. На Сухнешчыўскім, Юравіцкага сельсавету, скінута 4.500 кбм. экспартных матар'ялаў, якія могуць быць затоплены. Ня лепшае становішча і на прыстанях Дамікоўскага сельсавету, якія знаходзяцца на беразе р. Обсьніцы. Там ляжыць 2.000 кбм., якім таксама пагражае паводка. Наогул у часе лезаходу могуць загінуць каля 16.000 кбм. каштоўных лесаматар'ялаў.

Праўда, полацкі леспрамгас прыняў некаторыя меры, каб патрэдзіць зьнішчэньне лесаматар'ялаў. Выпучаны работнікі, адказныя за становішча румаў, абсыпаны забясьпечаны лапцутамі, дротам, вартавым прапанавана сыстэматычна наведваць за прыбыцьцём вады і паведамляць аб пагрозе паводкі. Але ўсё-ж прынятыя меры нельга лічыць выстарчальнымі.

Трэба мабілізаваць сілы сельсаветаў, каб у патрэбны момант, па першым заклику, сабраць патрэбную колькасьць рабочых рук.

Нельга дапусьціць зьнясеньня вадой 16.000 кбм. лесу!

А. Шустры.

Не пускаць у вадзе ніводнага бервяна

Бабруйскі раён не падрыхтаваны да сплаву

Не хапае прыстагонаў—сплаўныя пункты не забясьпечаны прадуктамі

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Падрыхтоўка да сплаву па раёне пракрэзіць яўна нездавальняючая і пагражае срывам кампаніі.

Бабруйскі леспрамгас павінен вывезьці 200.000 куб.мэтраў драўніны. Вывез ён фактычна 60.000 кбм., што складае каля 40 проц. патрэбнай колькасьці.

Правален плян загатовак гужбы, што пагражае пасьпяховаму разгортваньню сплаву. Заданьне загатавіць 150.000 штук гужбы выканана толькі на 30 проц. загатоўлена 45.000 шт.

Надзвычай павольна ідзе вярбоўка рабочых-сплаўшчыкаў. Бабруйскай сплаўной канторы патрэбна 8.000 чал. Дагэтуль завербавана 2.700 плытагонаў. Сельскія саветы мала дапамагаюць вярбоўцы рабочай сілы.

Спажывецкае таварыства не падрыхтавалася да абслугоўваньня мас рабочых плытагонаў. Вызначана адкрыць сталоўкі на сплавах, але пануль што ў гэтай галіне нічога ня зроблена.

Ня гледзячы на прапанову цэнтральных органаў завезьці для патрэб сплаву да 1-га красавіка 65 проц. патрэбнай колькасьці прамтаварэў, у Бабруйскі раён завезена толькі 25—30 проц. Асабліва востра стаіць пытаньне аб забясьпячэньні плытагонаў ботамі. Цэнтральныя арганізацыі зацьвердзілі кантрольную лічбу завозу ботаў для Бабруйскай канторы ў разьмеры 11.000 пар. На сёньняшні дзень ёсьць толькі 3.000 пар. Недахват ботаў можа адмоўна адбіцца на ходзе сплаву.

Не хапае тэхнічнага пэрсоналу. Дырэктывы аб адкамандыраваньні на сплаву спэцыялістаў на сплаве ігнаруюцца. Бабруйскі леспрамгас павінен быў адкамандыраваць 12 спэцыялістаў, на сплаве-ж сплаўная кантора не атрымала ні аднаго чалавека.

Пляну першага кварталу Бабруйскі леспрамгас ня выканаў. Заданьне па загатоўцы дзелавой драўніны выканана на 75 проц., дроў—на 25 проц. Вывезена 50,5 проц. заданьня па дзелавой драўніне і 37 проц. па дрывах.

Другі квартал ня даў пералому. Прарыў пагыбляецца. Плян загатовак за першую дэкаду красавіка ажыцьцёўлен менш, чым на 25 проц. (па лесаматар'ялах). Бабруйскі раён, як і раней, адстае ад іншых раёнаў БССР.

У бліжэйшыя дні павінен пачацца сплаў. Усе арганізацыі павінны перабудзіць сваю работу, каб забясьпечыць пасьпяховы ход сплаву. Усякім надзеям на самацёк, апартуністычнай недаацэнцы кампаніі трэба даць рашучы адпор.

Прэзыдыум Бабруйскага райвыканкому пастанавіў арганізаваць камісію садзейнічаць сплаву і мабілізаваць усе ўнутраныя рэсурсы.

Д. А.

На гарадзкой канфэрэнцыі прафсаюзаў

У другім квартале ліквідаваць прарыў 1-га кварталу

16-га красавіка па раніцнім пасяджэньні адбыліся спрэчкі па дакладу тав. **Рыжова.** Выступіла 22 дэлегаты. Кожнае выступленьне—наказ новаму гарпрафсавету, разгарнутая праграма дзеяньняў. Дэлегаты спыняліся на асноўных задачах сацыялістычнага будаўніцтва, якія патрабуюць гібкага і апэрацыйнага кіраўніцтва з боку прафсаюзаў.

Вячэрняе пасяджэньне пачалося з дакладу старшыні ВСНГ тав. **Грысевіча** аб выніках выканаўчага прамфінпляну за першы квартал 1931 г. і задачах прафсаюзаў.

Праграма першага кварталу хаця і дае рост у параўнаньні з адпаведным кварталам мінулага году ўсё-ж ня выканана. Выканаўчае дасягае толькі 84 проц. Найбольшы прарыў—у хэмічнай прамысловасьці, якая выканала плян усяго на 53,7 проц., шкляная прамысловасьць выканала плян на 64 проц., мэталёвая—на 66,6 проц. Параўнальна больш процант выканаўчага дае шкіпная прамысловасьць—94,7 проц. і скураная—92,3 проц.

Гэтыя факты сьведчаць аб тым, што прафсаюзы ў радзе месц не ў выстарчальнай меры змагаліся за прамфінплян, ня здолелі накіраваць творчы энтузіязм рабочых мас на поўнае выканаўчае плянаў. Слаба паладжана ў асобных прафячэйках кіраўніцтва сацыялістычным спаборніцтвам і ўдарніцтвам, не паладжана масавая культурна-выхаваўчая работа.

Тав. **Грысевіч** прыводзіць лічбы, якія сьведчаць аб значным паляпшэньні ўмоў працы рабочых. На бесьперапынных тыдзнях пераведзена да 1-га сакавіка—81,1 проц. рабочых. На 7-гадзінны рабочы дзень—59,7 проц. усёй занятай у прамысловасьці рабочай сілы.

Ня выканана праграма па зьніжэньні сабекошту. На радзе прадпрыемстваў і галін прамысловасьці ёсьць нават рост сабекошту супроць мінулага году. Усё яшчэ вялікі брак на прадпрыемствах. На запалкавай прамысловасьці брак нават падняўся. Расьце брак і на віцебскай гарбарні. Рост прадукцыйнасьці працы адстае ад заработнай платы. Кампанія перагляду норм выпрацоўкі павінна паслужыць выкананьню паказальнікаў аб павышэньні прадукцыйнасьці працы.

Пасьля дакладу тав. **Грысевіча**, канфэрэнцыю вітала дэлегацыя, гарбарні **«Бальшавік»**, **чырвонаармэйцы** № самарскай дывізіі, часьцей АДПУ, рабочыя чыгункі. Чырвонаармэец, № 2-ай самарскай член ЦВК, тав. **Жаўтоўскі** запэўніў канфэрэнцыю, што Чырвоная армія будзе моцна стаяць на варце пяцігодкі і дасьць заслужаны адпор ворагу, калі ён патрабуе перапяцідзіць нашаму будаўніцтву.

Раніцняе пасяджэньне 17-га красавіка пачалося са справаздачы тав. **Эйдэльштэйна** аб рабоце страхкасы.

У параўнаньні з мінулым годам, лік застрахаваных узрос на 47,7 проц. Асноўныя сродкі ўзрасьлі на 43 проц. Значна палепшылася абслугоўваньне застрахаваных. Мэдычная дапамога набліжана да цэху. Па радзе буйнейшых прадпрыемстваў арганізоўваюцца выплатныя пункты страхкасы. Аднак, ёсьць і рад недахопаў у абслугоўваньні застрахаваных. Вялікая запазычанасьць лічыцца за страхавацелямі. Тав. **Эйдэльштэйн** спыніўся на задачах перабудовы страхавых органаў і ўдзеле ў гэтай рабоце шырокіх колаў дэлегатаў канфэрэнцыі прыняць актыўны ўдзел у практычнай рабоце страхкасы, на аснове самакрытыкі—вывяць недахопы ў рабоце касы, выкрываць сымулянтаў на прадпрыемствах.

Пасьля спрэчак і заключнай прамовы тав. Эйдэльштэйна, на вячэрнім пасяджэньні былі прыняты рэзалюцыі по ўсіх дакладах і выбран гарадзкі савет прафсаюзаў.

Агранаў.

Зачыненьне канфэрэнцыі

На вячэрнім пасяджэньні 17 красавіка была заслухана інфармацыя нам. старшыні аддзяленьня Дзяржбанку тав. Шэрмана аб новай кредытнай рэформе. Прынята рэзалюцыя па дакладах т.т. Рыжова, Грысевіча і Эйдэльштэйна, адочна аб перабудове прафсаюзаў тварам да вытворчасьці, конкурс на лепшае правядзеньне веснавой прыгарадняй кампаніі. У пленум гарпрафсавету выбраны 71 чал., у рэвізійную камісію — 7 чал., у гарстрахкасу — 31 чал., у рэўкамісію — 5.

Падрабязнасьці ў заўтрашнім нумары.

Патрэбна ўмяшаньне пракуратуры

Рабочы вылучэнец Менскага лесазаводу «Пралетары» тав. **Н. Рутман** быў мабілізаваны для дапамогі лесазагатоўкам у Калінкавіцкім раёне. Адразу-жён сустрэў няўважлівыя адносіны з боку дырэктара леспрамгасу тав. **Сіманоўкера:** «Наколькі я не атрымаў афіцыяльнага паведамленьня з Лесбелу, я з вамі ніякіх спраў ня маю».

«Лепш прыслалі-б мне два вагоны аўса, чым брыгадзіра,—заявіў дырэктар супрацоўнікам леспрамгасу.

Праз некалькі дзён усё-ж Сіманоўкер паслаў брыгадзіра ў Астанковіцкі вучлесгас, дзе былі вялікія прарывы ў загатоўках. Тав. Рутману ўдалося выкрыць рад злоўжываньняў на вучастку: п'янства з боку некаторых дзесятнікаў, пасаваньне лесаматар'ялаў, натуральнае кулацтву, разбазараньне прадуктаў і г. д. Загадчык лесгасу тав. **Руцько**, атрымаўшы некалькі пар валёнак для разьмеркаваньня сярод рабочых-лесарубаў, раздаў іх сваім сваякам. Дзесятнік **Анісімаў** вельмі груба адносіўся да сялян, неадпраўлены ім прадуктаў і замест таго, каб растлумачыць сялянам прычыны труднасьцей у забясьпячэньні, часта займаўся антысавецкай агітацыяй. На вучастку разбазаравалі авёс—замест 80 кілё выпісвалі 160, замест 150—300 і г. д. Пабываўшы ў сельсаветах, тав. Рутман выявіў, што некаторыя сялянам давалі авёс авансам, і большасьць з іх зусім не выяжджала ў лес.

Ня гледзячы на тое, што брыгадзір Рутман аб усіх гэтых фактах паведаміў Калінкавіцкаму леспрамгасу ніякіх мер дагэтуль ня было прынята.

Парадкамі ў Астанковіцкім вучлесгасе павінна зацікавіцца мясцовая пракуратура.

Б. К.

Адказны рэдактар
С. БУДЗІНСКІ.

СЬПІС

таварышоў, вылучаных Культпропам ЦК КП(б)Б у якасьці дакладчыкаў аб выніках Усесаюзнай нарады па пытаньнях рабселькораўскага руху

Згодна пастановы сакратарыяту ЦК КП(б)Б аб вылучэньні групы дакладчыкаў для дакладаў на раённых і гарадзкіх партыйных актывах, Культпропам ЦК КП(б)Б мабілізуюцца наступныя таварышы:

Мітлін («Зьвязда») — даклад. рабіць у Буда-Кашалёве.
Красіна («Рабочий») — дакл. рабіць у Жлобіне і Асіповічах.
Блісноўскі (прад. «Правды»)—дакл. рабіць у Барысаве.
Курцін (Культпроп ЦК КП(б)Б—Бабруйск, залішнейшы раён Гомель.
Шастакоў («Савецк. Белар.»)—Асьвея, Багушэўскі РК.
Дунец («Акцябр») — Бешанковічы, Бягомль.
Платаў («Чырв. Зьмена»)—Буда-Кашалёва і Браціна.
Вітлін (Культпроп ЦК) — Шклоў і Выхаў.
Бэр («Акцябр») — Высачаны і Бярэзіна.
Паўлоўскі (ТАС Бел. — Заслаўе.
Вержбаловіч — Коханава і Крупкі.
Сиканальскі (Парткалектыў рэдакцыі) — Клімавічы Копысь.
Шмідт («Калгасьнік Беларусі») —Койданава і Лагойск.
Давідовіч («Падеская Праўда»)—Чачэрскі і Хойніцкі.
Розэнблюм — Уваравічы і Камарынскі.
Рубінштэйн («Віцебскі Пралетары») — Сеншо і Горкі.
Лебедзеў («Чырвоная Полаччына») — Вушачы і Лепель.
Адамсон («Камуніст») — Парычы.
Грынглаўз («Кам. Магілеўшчыны») — Кармянскі і Журавічы.
Пятроў («Кам. Магілеўшчыны»)—Краснапольскі і Прапойск.
Фішбэйн («Рэчыцкая Праўда») — Лоеўскі.
Бугроў (Слуцкая газэта) — Старыя Дарогі і Старобін.
Фалкін (Быхаўская газэта) — Рагачоў.
Халепа (Копыльская газэта) — Гірскі раён, Чырвона-Слабодзкі.

РЭЗЭРВОВАЯ ГРУПА:

Прынц («Орка»), **Кірштэйн** (Орка»), **Самуцін** («Зьвязда»), **Лыньковуй, Бутдзін, Старавойтаў.**

Даклады павінны папулярызаваць пастановы Усесаюзнай нарады па пытаньнях рабселькораўскага руху, пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб сельскім, раённым і нізавым друку і пастановы ЦК КП(б)Б аб масавым ахваце самакрытыкі, рабселькораўскага руху і партыйнага кіраўніцтва ім, аб перавыбарах рэдкалегій нізавых газэт, аб скліканьні Усебеларускага з'езду рабселькораў.

Матар'ялы для дакладу: рэзалюцыі ЦК УсеЦК(б) і ЦК КП(б)Б па вышэйпералічаных пытаньнях, а таксама матар'ялы Усесаюзнай нарады.

Аб тэрміне выезду дакладчыкі павінны зьвяртацца ў Культпроп ЦК КП(б)Б (пакой № 11) да тав. Фуксона.

Загадчык Культпропу ЦК КП(б)Б А. ЧАРНУШЭВІЧ.

Беларускі Дзяржаўны Тэатр І. Гурскі. 19 красавіка адкрыцьцё сэзону спэктакль **КАЧАГАРЫ** п'еса ў 4 дзеях. Пачатак у 8 гадз. веч.

ДОМ Працаўсьветы. Сёньня. 18 красавіка—кіно **ІНЖЫНЭР ЕЛАГІН** Пачатак у 8 і 10 гадз. веч.

Гукавы кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“ **ДЗЬВЕ СІЛЫ** Зьвыш праграмы гукавы фільм **ПОШТА** Пач. у 7 гг. 8 г. 45 м. і 10 гадз. 30 м. **КАСА—з 5 гадз.**

Кіно-тэатр „Культура“ **Старац Васіль Гразноў** Хроніка № 13. Пач.: 7 г., 8 г. 45 м., і 10 г. 30 м. Каса—з 5 гадз.

Кіно „Інтэрнацыянал“ **2-гі тыдзень 2-гі** Гістарычны фільм **Ледзяны дом**

КІНО „Пралетары“ 1) ПАТ і ПАТАШОН у лепшай камэдыі 7 частак. **ПАЧАТАК КАР'ЕРЫ.** 2) ЗАМЕЖНЫ ПАХОД у 2 ч. Пачатак у 6 г.

КІНО „Юны Піянэр“ **ПАКІНУТЫ ВОСТРАЎ** кін о-п'еса ў 6 частак. Кіно-хроніка № 16. Пачатак сэансаў у 1 гадз. дня. Каса—з 11 г. 30 м.

Кіно „Спартак“ Нямецкі банёк **ДРУГОЕ ЖЫЦЬЦЁ** Драма ў 8 частках. Пач.: 7 г., 9 г., і 10 г. 45 м. Каса—з 5 гадз.

ПЕРШЫ ЎСЕБЕ АРУСКІ ЗЬЕЗД СЛЮЗУ РАБОТНІКАЎ ДЗЯРЖУСТАНОЎ АДКРЫВАЕЦЦА СЕНЬНЯ 18-га красавіка ў 7 гадзін вечара у памяшканьні клюбу саўгандальслужачых (рог Камуністычнай і Энгельса). **Фракцыя зьезду адбудзецца ў 5 г. вечара там-жа.** Рэгістрацыя дэлегатаў і выдача мандатаў будзе праводзіцца 17 і 18 красавіка ў аргбюро зьезду—Пляц Волі, Дом Працы, 3 паверх, 4 пакой. Аргбюро.
387.

Кошт публікацыі аб згубе і дакументу **1 р.**

Інстытут філёзофіі Беларускай Акадэміі Навук СЕНЬНЯ, ў 6 гадз. вечара ў залі Акадэміі (рог Ленінскай і Універсітэцкай № 29-35, паверх II) скліканае **АРГАНІЗАЦЫЙНУЮ НАРАДУ АНТЫРЭЛІГІЙНАГА СЭКТАРУ.** На нараду павінны зьявіцца прадстаўнікі ад вузен СССР—Наўпедтэхнікуму, Хімічнага Інстытуту і ўсіх факультэтаў Бел. Дзярж. Унівэрсытэту. Персональна запрашаюцца т. т.: Шукевіч-Трашкіноў, Даўгеполаў, Розэнгаўз, Усьпенскі, Гесэн, Кернажыцкі, Богдановіч, Альтман, Рубін, Клыс, Дамброўскі, Марэйсіна, Кукелка, Жукаў, Міхайлаў, Хаменка, Файнберг, Шолюта, Яневеч, Троцкі, Ванчук, Мацартаў, Васільеў, Страпчанка, Онгараў, Захаравіч, Дзерзвяга, Пабіткіна, Краснапёрка, Контус, Марголін, Шабароўскі, Нікіціна, Карыцка, Мельнік, Бакун, Кенджук, Гурвіч, Залуцкая, Булат, Забаўскі, Якшэвіч, Бучукас, Уголік, Бабковіч, Грынкевіч, Масланавец, Ынгер, Мілашэўская, Красьнік. Яўка ўсіх навуковых працаўнікоў і аспірантаў Інстытуту філёзофіі абавязкова. 384

Рагачоўская навучальна-курсавая база Белкаапоюзу паведамляе, што з 12-га красавіка адкрыт прыём заяў у чарговы набор на **4-хмесячныя КУРСЫ** па рахунаведзтву **для 35 чалавек.** Заявы прымаюцца да 25 красавіка г. г. у канцылярыі Рагачоўскай школы КГВ і навучальна-курсавой базы па адрасе: г. р. Рагачоў, Сацыялістычная вул., д. № 4-а. Заняткі пачнуцца 3-га мая. Умовы прыёму: у першую чаргу прымаюцца рабочыя, батракі, сельска-гаспадарчыя рабочыя, калгасьнікі і беднята, а потым прымаюцца сераднякі, служачыя і самаўтыкі ва ўзросьце ад 18 да 35 год з асьвятай за 7 груп сямігадовай працоўнай школы, але на ніжэй 6 груп. Курсанты забясьпечваюцца стыпендыяй, інтэрнатам і харчаваньнем за кошт стыпендыі, што атрымліваюць (сьнеданьне, абед і вячэра). Перавага ў прыёме будзе дана камандыраваным спартаварыствамі асобам. Да заяў неабходна дадаць наступныя дакументы: 1) даведку аб сацыяльным становішчы, пахаджэньні і падатку; 2) даведку аб стане здароўя; 3) пасьведчаньне ці даведку аб асьвеце; 4) даведку аб узросьце і 5) камандыроўку, калі яна будзе. Без дакументаў заявы ня будуць разглядацца. Усе дакументы накіроўваць па вышэйпаказаным адрасе з дадаткам 20-капеечнай маркі, пашт. маркі на 20 кап. Кіраўніцтва рагачоўскай курсавой БКС. 389.

Даводзіцца да ведама ўсіх таварышоў, якія зьвічаны на ў веснавы набор і не зьявіліся да 10-IV па заняткі, што **ў выпадку іх неаўкі ДА 20-IV—31 г. ім БУДУЦЬ ВЫКЛЮЧАНЫ з ліку студэнтоў** і на іх месца будуць залічаны кандыдаты. 379

ПЭДФАК БДУ

СТЭНАГРАФІЯ для ўсіх Кіраўніцтва для самаазучэньня. Укладнік Сакалоў. Ухвалена навуч. стэнагр. т-вам. 3 прыёмы, слоўнічка. Цана 2 р. 75 к. з перасылкай.

„ДРУГ ДОМОХОЗЯЙКИ“ Кіраўніцтва кройкі і шыцьця, што дае магчымасьць вывучыць неабходныя і зусім выстарчальныя для сям'і весьці па кройцы і шыцьці ў 75 урокаў. Цана 2 р. з перасылкай.

ШКОЛА-САМАВУЧЫЛЬНІК ІГРЫ НА ДВУХ РАДНЫМ ГАРМОНІКУ Склаў Перакрэстаў. Цана 2 р. 25 к. з перасылкай.

САМАТУЖНАЯ ВЫТВОРЧАСЬЦЬ мінэральн. расьліны і зьвёрыных фарб. Склаў Перакрэстаў. Цана 2 р. 30 кап. з перасылкай.

„РЕМЕСЛА НА ДОМУ“ (ХАТНІ МАЙСТАР) Работы на дрэве і мэталі; выраб цацак; плясьценьне з лозы і вяровак; пакеты, карбоні, перапяўты, электратэхніка, радыё, фатаграфія, фарбаваньне тканін, выраб атрамантуў і інш. з 306 мал. Склаў Іваненка. Цана 2 р. 85 кап. з пасылкай.

МУЗЫКА СЛОВА І ШКОЛА АРАТАРА Дапаможнік для аратарачытачоў, аратараў, вэтэраў, дэкламатараў, школьных работнікаў, сьпевакоў, настаўнікаў мастацк. чыт. і драматычн. мастацтва, гуртаводцаў і кампазытараў. Склаў Сяроженкаў. Цана 2 руб. 85 кап. з перасылкай.

АГУЛЬНАДАСТУПНЫ СТОЛ „НАША КУХНЯ“ Сьв. ГАНЯТОЎСКАЯ і КЯНРАСАВА. 558 рацэптаў розных страў, прыстасоўна да сучасных умоў. Цана 2 руб. 10 кап. з перасылкай. Высылаюцца пасылкамі без задатку. Масква, 10. Дзяржаўская, 30 „КОСТОРГІН“.

ПАДПІСВАЙЦЕСЯ на МАЙ і далейшыя м-цы 1931 г. НА ГАЗЭТУ **„ЗЬВЯЗДА“** Падпісная плата—на 1 мес.—1 руб. Падпіска прымаецца ўсюды на пошце.

Усебеларуская кантора Дзяржбанку абвяшчае, што сёньня, 18 красавіка, роўна ў 7 гадзін вечара, у памяшканьні канторы Дзяржбанку, 2-гі паверх, АДБУДЗЕЦЦА чарговая сустрэча гаспадарнікаў пляжвікоў і бухгальтараў з Дзяржбанкам. Парадак дня: даклады т.т. Кузьнецова (прадстаўнік праўленьня Дзяржбанку і Балоцкіна (галоўны бухгальтар канторы) на пытаньнях зьмен у крэдытнай рэформе. Запрашаюцца шэфы—рабочыя заводу „Бальшавік“. Усебеларуская кантора Дзяржбанку.

ЛІКВІДАЦЫЙНАЯ КАМІСІЯ ЕРГ сяўсу сельгаспрацоўных заводзіць на вядомы арганізацыі з'ўсякай, што ў сувязі з ліквідацыяй БРК **ПРЭЗЭНЦ** іншыя саюзу сельгаспрацоўных, ліквідуецца. **НА 25 красавіка 1931 г.** Пасьля гэтага тэрміну на іншы прэтэнзіі ніякіх ня будзе прыймацца. ЛІКВІДАЦЫЯ.

20 красавіка, роўна ў 7 гадз. веч., **у пятымін. групкому 2** (Інтэрнацыянальная, 18) скліканае **АГУЛЬНЫ СХОД УСІХ БУФЭТЧЫКАЎ МЦРК.** Парадак дня: 1. Справаздача праўленьня МЦРК аб працы ў буфэтах. 2. Аб сьвяткаваньні 1 мая. 3. Аб сацспаборніцтве і ўдарніцтве. 4. Прыём у прафсаюз. 5. Рознае. ЯЎКА АБАВЯЗКОВА І БЕЗ СПАЗЬНЕНЬНЯ.

Смаляльнскі тэхнікум сац. земляробства абвяшчае, што **тэрмін падачы заяў** аб паступленьні ў тэхнікум **працягнут да 25 красавіка.** Умовы прыёму згодна правіл, надрукаваных у „Сьв. Бел.“ ад 1-III 31 г. **Дырэкцыя тэхнікуму.**

ПАТРАБУЮЦЦА ВОПЫТНЫЯ КАРЭКТАРЫ, добра ведаючыя беларускую мову. Кантора «Зьвязды»

Менск, друкарня «Зьвязды».

Сёньня у памяшканьні Гаркому КП(б)Б (заля пасяджэньняў) **скліканае**

АБ'ЯДНАНЫ ПЛЕНУМ МЕНГАРКОМУ КП(б)Б І ГАРАДЗКОЙ КАНТРОЛЬНАЙ КАМІСІІ КП(б)Б.

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Выніці выканаўчага прамфінпляну па гор. Менску за 1-шы квартал і дэлешыя задачы.
2. Аб падрыхтоўцы да веснавой сяўбы і ходзе калектывізацыі.
3. Становішча і плян разьвіцьця камунальнай гаспадаркі гор. Менску на 1931 г.
4. Аб перабудове масавай работы Гарсаветаў і сельсаветаў.

Апрача членаў і кандыдатаў Гаркому КП(б)Б, рэвізіі, камісіі Гаркому КП(б)Б, членаў і кандыдатаў Гарадзкой Кантрольнай Камісіі, на пленум запрашаюцца: па першым пытаньні—сакратары партыяцэйкаў—начэльнікі і дырэктары прадпрыемстваў—камуністы. па другім—сакратары вясковых парт'ячэек, старшыні сельсаветаў, старшыні калгасаў і кіраўнікі саўгасаў—кам